№ 2(32)/2001

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, люты 2001 г.

## НЕ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА — ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ, А НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ І СВАБОДА, БО НЕ БЫВАЕ "ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА" ПАД АКУПАЦЫЯЙ




*Акцыя "За нашу і вашу свабоду" ў Нью-Ёрку. 23 лютага.*

## ЗА НАШУ І ВАШУ СВАБОДУ

Пад такім дэвізам і пад лёзунгамі ***„Свабоду Чачэніі – абаронім незалежнасьць Беларусі!"*** ды ***„Спыніць разгул расейскага імпэрыялізму!"*** *23 лютага* прайшла міжнародная акцыя салідарнасьці з чачэнскім і беларускім народамі, якія супроцьстаяць агрэсіі расейскай імпэрыі. Пікеты і дэманстрацыі адбыліся *ў Татарстане, Грузіі, шэрагу гарадоў Польшчы (Кракаў, Варшава), у Злучаных Штатах Амэрыкі. У Вільні* дэманстрацыю наладзіла *Таварыства Беларускай Культуры.* Галоўным ініцыятарам міжнароднай акцыі выступіў *Камітэт Польшча-Беларусь імя генэрала Станіслава Булак-Балаховіча.*

У Беларусі акцыя распачалася яшчэ *19 лютага*, калі па ўсёй краіне актывісты *Вызвольнага Руху* пачалі распаўсюджваць улёткі ***„Прэч расейскіх акупантаў!"*** і ***„Расея – імпэрыя зла"***.

Дата акцыі была выбрана невыпадкова. *23 лютага 1944 г.* расейскі НКВД па загаду Крамля зьдзейсьніў адно з найвялікшых злачынстваў Другой сусьветнай вайны. Былі гвалтоўна выселеныя з роднай зямлі і высланыя ў Сярэднюю Азію і Запаляр'е цэлыя народы – чачэнцы, інгушы, аварцы, калмыкі. Цяперашняя расейская імпэрыя працягвае зьнішчальную каляніяльную палітыку на Каўказе, а Беларусь абраная ахвярай расейскай экспансіі на заходнім кірунку.

*23 лютага* да амбасады Расейскай Фэдэрацыі ў Менску прыйшлі



***Камітэт Польшча-Беларусь. Акцыя „За нашу і вашу свабоду" ў Кракаве каля расейскага консульства. 23 лютага.***

15 актывістаў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*. Яны разгарнулі чачэнскія і беларускія *Бел-Чырвона-Белыя* сьцягі ды заявілі пра жаданьне перадаць *Пэтыцыю пратэсту* да палітычнага кіраўніцтва РФ. Аднак ніхто да беларусаў з амбасады ня выйшаў. Затым 20 сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* прыйшлі пад чэчэнскімі і беларускімі сьцягамі да сядзібы Кансультацыйна-Назіральніцкай групы АБСЭ, каб перадаць *Пэтыцыю* да кіраўніцтва і краінаў-удзельніц АБСЭ. *У Пэтыцыі* выказаны пратэст супроць падтрымкі заходнімі краінамі Расеі – краіны-агрэсара — і патрабаваньне выдаленьня зь Беларусі сп. **Віка**, кіраўніка КНГ АБСЭ ў Менску, які *працягвае сваю антыбеларускую палітыку*. Пэтыцыю прынялі супрацоўнікі КНГ.

*У Нью-Ёрку* насупроць будынку *ААН* таксама адбылася дэманстрацыя беларусаў у рамках гэтай міжнароднай акцыі. Падрыхтавалі яе прадстаўнікі *Беларускага Народнага Фронту* і Нью-Ёркскага аддзелу *БАЗА* пад агульным заклікам: ***„Свабоду — Беларусі, Незалежнасьць — Чачэніі!"*** Было шмат лёзунгаў на беларускай і ангельскай мовах (***„Амэрыка, дапамажы Чачэніі!","Прэзыдэнт Буш, спыні падтрымку кагэбоўскай Расеі!"*** і інш.). Удзельнікі дэманстрацыі раздавалі нью-ёркцам падрыхтаваную з гэтай нагоды інфармацыйную ўлётку на ангельскай мове.

Прамаўлялі беларусы-уцекачы зь Менску, а таксама кіраўнікі *БАЗА* — **Антон Шукелойць** і **Віталь Зайка**.

Выступаючы на мітынгу, Старшыня *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Зянон Пазьняк*** заявіў: *„Мы ўспамінаем гадавіну дэпартацыі расейцамі чачэнскага народу ў лютым 1944 году. Падобны лёс можа напаткаць і беларускі народ, калі ён сам сябе не абароніць. Падтрымка расейскай уладай рэжыма Лукашэнкі прывяла да татальнага парушэньня правоў беларусаў. Расея праводзіць аднолькавую палітыку ў адносінах да Чачэніі і Беларусі. Імкнецца зьнішчыць абодва народы, толькі рознымі сродкамі. Чачэнцаў, якія ўзяліся за зброю, зьнішчае танкамі. Беларусаў – палітычнымі мэтадамі і маніпулюючы марыянэткавым дыктатарам Лукашэнкам. Усё зло ідзе з Расеі"*. Дэманстранты трымалі чачэнскія і беларускія сьцягі.

*У Вільні* акцыя адбылася *25 лютага.* У самым цэнтры горада перад гарадзкой Управай прайшоў мітынг. Былі чачэнскія і беларускія сьцягі.

Акрамя *Таварыства Беларускай Культуры* акцыю падтрымалі сябры Цэнтру грамадзкіх ініцыятываў *„Дэмакратыя для Беларусі"*. Удзельнікі мітынгу трымалі ў руках плякаты: ***„Сёньня Чачэнія! Заўтра Беларусь! А пасьлязаўтра?..", „Беларусь — не губернія Расеі!"*** і інш. Сярод выступоўцаў былі й дэпутаты Сэйму Летувы спадары ***Ляндсбэргіс*** і ***Кубілюс***.

Быў прыняты выніковы дакумант (пэтыцыя), у якім адзначана неабходнасьць:

*— патрабаваць ад Расеі, пры ўдзеле трэцяга боку, пачаць перамовы з законна абраным чачэнскім прэзыдэнтам Масхадавым;*

*— расьследаваць зробленыя Расеяй у Чачэніі злачынствы супраць чачэнскага народу, спакою і ўсяго чалавецтва ды прыцягнуць яе да адказнасьці як ваеннага злачынцу*

*— прызнаць за чачэнскім народам права вырашаць свой лёс самастойна.*

У гэты ж дзень *23 лютага* ў варшаўскім Музэі Незалежнасьці адбылася памятная ўрачыстасьць, пасьвечаная 57-й гадавіне дэпартацыі чачэнцаў зь іхняе радзімы ў Сібір. Высяленьнем кіраваў галоўны на той час сталінскі злачынца Лаўрэнцій Берыя. Падчас высяленьня рускія забілі, замучылі, замарылі на сьмерць каля 30 тысячаў чачэнцаў. Дзясяткі тысячаў памерлі ў цягніках падчас дэпартацыі. Старых і нямоглых рускія зьнішчалі.

*27 лютага 1944 г. ў Хэйбах* чачэнскіх кабет, старых, хворых, калек і дзяцей бальшавікі сагналі ў калгасную стайню і спалілі. Палкоўніка НКВД, які зрабіў гэта, Масква ўзнагародзіла і павысіла па службе.

У Сібіры чачэнцаў, якія выжылі ў дарозе, выгрузілі ў пусты марозны стэп, акружаны калючым дротам і пакінулі паміраць. Але чачэнцы змагаліся за жыцьцё і не памерлі.

Цяперака руская тэрарыстычная армія праводзіць генацыд чачэнцаў ужо на іхняй тэрыторыі. Цьвітучую раней зямлю ператвараюць ў бязьлюдны стэп.

***Валеры БУЙВАЛ, Тамаш РАКСА***




***Акцыя "За нашу і вашу свабоду" ў Вільні. 25 лютага.***

# ПРАТЭСТ БЕЛАРУСАЎ СУПРАЦЬ АГРЭСІЎНАЙ ПАЛІТЫКІ РАСЕІ

*(Вытрымкі са звароту дэманстрантаў у Нью-Ёрку)*



*Камітэт Польшча-Беларусь. Акцыя ў Кракаве. 23 лютага.*

Мы, беларусы, прадстаўнікі беларускай дыяспары ў ЗША, пратэстуем супраць імпэрскай палітыкі Расеі, якая падтрымлівае дыктатара Лукашэнку і антыбеларускі рэжым у Беларусі.

Мы пратэстуем супраць генацыду ў Чачэніі. Мы ўражаны людабойствам, якое робіць расейскае акупацыйнае войска ў свабоднай Чачэніі, забойствамі мірных жыхароў, замыканьнем людзей у канцэнтрацыйныя лягеры, катаваньнямі і зьдзекамі над чачэнскім народам...

У Беларусі палітыку нацыянальнага вынішчэньня расейцы праводзяць праз антыбеларускі дыктатарскі рэжым Лукашэнкі. У Беларусі бясследна зьнікаюць людзі — праціўнікі рэжыму. Рэжым Лукашэнкі перасьледуе ўсё беларускае, зачыніў беларускія школы і беларускі друк, разбурыў беларускую эканоміку; беларускі народ даведзены да галечы.

Мы падтрымліваем Беларускі Вызвольны Рух і барацьбу беларусаў на Бацькаўшчыне супраць дыктатуры і рэжыму расейскай акупацыі.

Мы падтрымліваем справядлівую барацьбу чачэнскага народа за незалежнасьць і свабоду.

Мы асуджаем расейскую агрэсію і расейскую вялікадзяржаўную палітыку.

Мы зьвяртаемся да Амэрыкі, да Прэзыдэнта Буша, да ўрадаў усіх дэмакратычных краінаў з патрабаваньнем спыніць падачкі і эканамічную дапамогу Расеі — краіне-агрэсару і падтрымаць справядлівую барацьбу беларусаў і чачэнцаў за свабоду, дэмакратыю і незалежнасьць.

***23 лютага 2001 г.*** — ***Арганізатары дэманстрацыі***
***Нью-Ёрк***

# ГОЛАС ГІНУЧЫХ У ЭЎРАПЕЙСКАЙ ПУСТЫНІ

*23 студзеня ў Варшаве*, за месяц да пачатку міжнароднай акцыі *„За нашу і вашу свабоду”* адбылася дэманстрацыя чачэнскіх уцекачоў, прымеркаваная да адкрыцьця сэсіі Эўрапарляманту. Чачэнцы перадалі пэтыцыю, скіраваную да міжнародных арганізацыяў, на рукі Камісару ААН па справах уцекачоў Хрысьціяну Ф. Мару.

У звароце напісана: „Гэты зварот павінен усьвядоміць ААН, Раду Бясьпекі ААН, Эўрапейскі Зьвяз, АБСЭ і міжнародную думку, што вызначаныя правы, канвэнцыі, асновы гуманізму і ідэалы дэмакратыі — гэта пустыя вартасьці ў рэальнай сітуацыі зьнішчэньня нашага народу, якое зьдзяйсьняе Расея, як сказана — „у імя яе інтарэсаў”...

Расейцы бесперастанна забіваюць цывільнае насельніцтва, зьнішчаюць інфраструктуру, гаспадарку і прыроду. Тэрыторыя Чачэніі ператвараецца ў мёртвую зону... На тэрыторыі самой Расеі трывае няспыннае паляваньне на чачэнцаў. Расісцкая практыка дыскрымінацыі ў дачыненьні да чачэнцаў стала афіцыйнай палітыкай расейскай дзяржавы...

Становішча сотняў тысячаў чачэнскіх уцекачоў, што ўцяклі ў суседнюю Інгушэцію, абазначаецца як гуманітарная катастрофа... Расейскія ўлады падрыхтавалі ім у Інгушэціі ўмовы галоднай сьмерці, альбо вынішчэньня ў выніку холаду і хваробаў...

Міжнародныя арганізацыі, такія як ААН, Рада Бясьпекі ААН, Эўразьвяз, АБСЭ, што прэтэндуюць на ролю суддзі, замест выкананьня сваіх функцыяў, зьнешне паказваюць, што ўсюды выступаюць за абарону правоў чалавека, абы толькі не на тэрыторыі Расеі.

Маладушнасьць і маральная бяздзейнасьць гэтых арганізацыяў успрымаюцца Расеяй як падтрымка для яе злачыннай палітыкі вайны ў Чачэніі...

Рада Эўропы дэ-факто палітычна і юрыдычна падтрымлівае расейскую каляніяльную інвазію ў Чачэнію. Яна не запатрабавала ад Расеі прызнаньня адказнасьці за вынікі першай вайны супраць Чачэніі, бескрытычна прымае расейскую прапагандысцкую хлусьню пра цяперашнюю вайну.

Чачэнскі народ, што стаіць перад пагрозай поўнага зьнішчэньня, абвінавачвае: Арганізацыю Аб’еднаных Нацыяў, Раду Эўропы, Эўрапейскі Зьвяз і АБСЭ ў бязьдзейнасьці ў справе Чачэніі, што



*Расейскія акупанты ў разбуранай сталіцы Чачэніі.*



***Сакавік, 2000 год. Рускія тэрарыстычныя войскі ў акупаванай Чачэніі праводзяць “свабодныя” расейскія выбары рускага прэзыдэнта. Прымусілі галасаваць чачэнцаў, што засталіся жывымі. “Выбары” паказалі ўсенародную “падтрымку” Пуціну.***

спрычыняецца да ўзаемнай адказнасьці за злачынствы супраць чалавецтва, якія прадаўжаюцца і выконваюцца расейскімі людабойцамі; Міжнародны Валютны Фонд — у адкрытым і скрытым фінансаваньні расейскага рэжыму...

Мы зьвяртаемся да грамадзянаў Эўропы і ўсяго сьвету з просьбай падняць голас у абарону гінучага чачэнскага народу, які не паддаецца агрэсару. Мы спадзяемся на Вашу дапамогу, салідарнасьць і супрацоўніцтва...

Ад імя чачэнскага народу патрабуем ад Рады Эўропы прыняцьця наступных захадаў:

*— неадкладнага выключэньня Расеі з Рады Эўропы за злачынствы, зробленыя над народам Чачэніі;*

*— запатрабаваць ад Расеі неадкладнага спыненьня вайсковых апэрацыяў і выводу ўзброеных сілаў з тэрыторыі Чачэніі;*

*— запатрабаваць ад Расеі неадкладнага вызваленьня вязьняў фільтрацыйных лягераў на тэрыторыі Чачэніі і ўсіх чачэнцаў, нелегальна замкнутых у турмы на тэрыторыі Расеі;*

*— запатрабаваць ад расейскіх уладаў прызнаньня адказнасьці за лёс* ***Руслана Аліхаджыева*** *— Старшыні парляманту Чачэнскай Рэспублікі Ічкерыя, замардаванага ў маскоўскай турме Ляфортава;*

*— запатрабаваць ад Расеі неадкладнага распачынаньня мірных перамоваў з легітымнай уладай Чачэніі, зь яе Прэзыдэнтам* ***Асланам Масхадавым****. Перамовы павінны адбывацца пры ўдзеле міжнародных назіральнікаў.”*

У дэманстрацыі чачэнскіх уцекачоў бралі ўдзел прадстаўнікі польскіх арганізацыяў і беларускай палітычнай эміграцыі.

***М. ВАНЬКЕВІЧ***

# НАЙБОЛЬШ ВЯДОМЫЯ ФІЛЬТРАЦЫЙНЫЯ (КАНЦЭНТРАЦЫЙНЫЯ) ЛЯГЕРЫ РАСЕЙСКІХ АКУПАЦЫЙНЫХ ВОЙСКАЎ У ЧАЧЭНІІ

1. Грозны, дэпо №1 (Ленінскі раён)
2. Грозны, дэпо №5 (Ленінскі раён)
3. Грозны, дэпо №2 (Заводзкі раён)
4. Грозны, Ханкала
5. Аўтуры, птушкафабрыка
6. Чарнакозава
7. Талстой-юрт
8. Маздок (Паўднёвая Асеція)
9. Урус-Мартан, будынак Мэдрэсэ
10. Урус-Мартан, будынак інтэрнату
11. Ачхой-Мартан, будынак гандлёвага цэнтру
12. Горагорск, на тэрыторыі малячарні
13. Старыя Атагі, птушкафабрыка
14. Гарачаводзкае, будынак Упраўленьня нафтавых таварыстваў
15. Сона, Шатойскі раён
16. Аргун, вагон №508 з 80 закладнікамі, зь якіх 25 ужо не жывуць

*(зьвесткі на травень 2000 г.)*

Фільтрацыйныя пункты ёсьць таксама ва ўсіх раённых аддзелах унутраных справаў і на блёкпастах.

На працягу двух войнаў ***загінула бяз вестак 16.500 чалавек***, якія



*Цывільныя жыхары Чачэніі ў расейскім фільтрацыйным (канцэнтрацыйным) лягеры.*

былі замкнутыя ў расейскіх фільтрацыйных лягерах. Пасьля аплаты выкупу расейцы выдалі чачэнцам некалькі тысячаў целаў. Сотні людзей, якіх адпусьцілі за выкуп, засталіся інвалідамі.

Мэтады катаваньняў, якія ўжываюць расейцы ў фільтрацыйных лягерах: электрычны ток,трыманьне вязьняў у бочках, напоўненых палівам для рухавікоў, у земляных ямах, цкаваньне сабакамі, адразаньне частак цела (вушы, пальцы), трыманьне жывых разам зь мёртвымі, зьверскае зьбіваньне.

# ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

## *ЛІСТАПАД (2000 год)*

*1 лістапада.* Больш за 20 тысячў менскіх настаўнікаў заявілі аб гатоўнасьці да страйку, калі да канца 2000 г. ўлады ня выканаюць сваіх абяцаньняў, якімі хацелі стрымаць настаўнікаў ад калектыўных дзеяньняў па абароне ўласных правоў. Сярод самых актыўных прыхільнікаў страйку — супрацоўнікі дашкольных установаў і школ. Памочніца выхавацелькі, якая працуе 12 гадзінаў у суткі, з 1-га кастрычніка атрымлівае ў сярэднім 16304 рублі у месяц.Загадчыца са стажам больш за 15 гадоў — 30420 рублёў. Заробак маладога настаўніка, які толькі што скончыў ВНУ, у верасьні быў роўны 14500 рублёў (14 даляраў). У. Ярмошын на зьезьдзе прафсаюзаў прызнаўся бюджэтнікам, што сродкаў на выпраўленьне сітуацыі няма.

У падтрымку настаўнікаў выступілі прамысловыя прадпрыемствы сталіцы і абкам прафсаюзаў хімікаў.

*1 лістапада.* На выбарчых участках у якасьці назіральнікаў працавала некалькі дзясяткаў студэнтаў з розных ВНУ. Большасьць зь іх (каля 20 чалавек) студэнты БДУ. За сваю дзейнасьць яны атрымалі папярэджаньне з дэканатаў, імі зацікавіліся органы дзяржбясьпекі.

Студэнт БДУ ***Уладзіслаў Ігнатовіч***: „За час майго назіраньня за працэсам галасаваньня мною былі выяўленыя шматлікія парушэньні грамадзянскіх правоў студэнтаў з боку дэкана філялягічнага факультэта БДУ **Мурынай Ларысы Аляксандраўны** (расейка-беларусафобка, паталягічна ненавідзіць усё беларускае) і намесьніка дэкана мэханіка-матэматычнага факультэта БДУ **Курсава Валерыя Ўладзімеравіча**. На ўсе гэтыя парушэньні мной было складзена больш за 50 актаў, якія былі накіраваныя ў АБСЭ. *29 кастрычніка*, я прыйшоў у студэнцкі інтэрнат і быў затрыманы супрацоўнікамі адміністрацыі інтэрнату, якія паведамілі мне, што па мяне прыходзілі з Камітэту дзяржбясьпекі. Адміністрацыя інтэрнату забараніла мне прыходзіць у інтэрнат."

Студэнтка ***Ала Біруля***: „*29 кастрычніка* на выбарчы ўчастак, дзе я працавала, прыйшлі два намесьнікі дэкана і папярэдзілі мяне, што мая прысутнасьць на ўчастку можа прывесьці мяне да дрэнных наступстваў."

***Сяргей Кнебелеў*** (таксама быў назіральнікам): „Адміністрацыя студэнцкага гарадка мяне папярэдзіла, што могуць узьнікнуць праблемы з навучаньнем ва ўнівэрсытэце і з маім пражываньнем у інтэрнаце. Мне паведамілі, што мной цікавіліся людзі з КДБ."

*1 лістапада ў Горадні* праводзіліся *Дзяды.* У гэты дзень ускладалі кветкі і запальвалі сьвечкі на магілах знакамітых гарадзенцаў. А 17-й гадзіне каля 40 чалавек з запаленымі сьвечкамі, *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі* рушылі па памятных мясьцінах гораду. Ля помніка Янку Купалу чыталі вершы паэта. У гэты час да помніка на вялікай хуткасьці з уключанымі ліхтарамі і сірэнамі пад'ехалі міліцэйскія машыны. Маёр міліцыі загадаў разыходзіцца, а ўсіх, у каго былі нацыянальныя *Бел-*

*Чырвона-Белыя сьцяжкі,* пачалі арыштоўваць. ***Сьвятлане Нех (Маладая Грамада)*** пры затрыманьні пашкодзілі руку (у аддзяленьні міліцыі да яе выклікалі лекара, каб спыніць кроў, і адвезьлі ў траўмапункт на рэнтген). Падчас затрыманьня закавалі ў кайданкі ***Аляксандра Міхальчыка, Міколу Ворана, Пётру Анісімовіча*** *(БНФ „Адраджэньне").* Затрыманых даставілі ў РАУС Ленінскага раёну Горадні, дзе былі складзеныя пратаколы па арт. 167.1 КаАП. П. Анісімовічу і М. Ворану былі ўручаныя позвы ў суд. Праз тры гадзіны ўсіх затрыманых адпусьцілі. Усе вярнуліся да помніка Янку Купалу, дзе ўшанаваньне продкаў было спыненае гвалтоўнымі дзеяньнямі міліцыі.

Ушанаваньне памяці продкаў працягвалася ў Каложы а 23-й гадзіне памінальнай службай. Былі затрыманыя: ***Сьвятлана Нех, Аксана Мілюн, Мікола Воран, Пётра Анісімовіч, Вадзім Саранчукоў, Юля Дарашкевіч, Вольга Іванова, Ірына Данілоўская, Зьміцер Іваноўскі, Зьміцер Хільмановіч, Генадзь Кургун, Віктар Кірэеў, Веслаў Біруля, Раман Рамашка, Ірына Салей, Кастусь Жынь, Аляксандар Міхальчык, Сяргей Мальчык, Сьвятлана Станкевіч, Сяргей Антусевіч, Уладзімер Чартапалаў, Ігар Бабкін, Дзяніс Івашын.*** (Пацярпелыя і абылганыя міліцыяй хочуць падаваць скаргі ў пракуратуру.)

*Лістапад, Магілёў.* Актывістка *„Маладога Фронту"* студэнтка філялягічнага факультэту Магілёўскага педагагічнага ўнівэрсытэту ***Ганна Зюзіна*** напярэдадні 15-га кастрычніка агітавала хлопцаў і дзяўчат ня йсьці на выбары. Яе актыўнасьць была заўважаная кіраўніцтвам унівэрсытэту. Праз нейкі час пасьля „выбараў" *Г.Зюзіну* адлічылі з унівэрсытэту („за сістэматычныя пропускі заняткаў").

Паводле дамовы з унівэрсытэтам, як гаворыць Ганна, студэнты, якія паступілі на платныя аддзяленьні, маюць магчымасьць не наведваць усе заняткі. Ганна накіравала скаргу ў пракуратуру і рыхтуе матэрыялы ў суд з патрабаваньнем аднавіць яе ва ўнівэрсытэце.

*Лістапад. Магілёў.* Студэнтку Магілёўскага вучылішча культуры ***Аляксейчыкаву*** адлічылі з-за таго, што яна не здала іспыт (як паведамілі ў адміністрацыі).

Ад студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах, патрабавалі пайсьці на выбары. Гэтая дзяўчына, бадай, была адзіная ў сваёй групе, якая адмовілася пайсьці на галасаваньне. Праз нейкі час яна „не змагла" здаць іспыт. *(Няздача іспыту ня ёсьць падставай для выключэньня.)*

*2 лістапада ў Горадні* пачаліся суды над *М. Воранам* (які адмовіўся размаўляць па-расейску і запатрабаваў перакладчыка) і *П. Анісімовічам* (які запатрабаваў адкрытага судовага працэсу). Судовыя працэсы адкладзеныя. (Пазьней суд палічыў, што падстава для затрыманьня была недастатковая. Справа адносна П.Анісімовіча спыненая цалкам. Адносна М.Ворана суддзя С.Ярашэвіч палічыў, што міліцыянты затрымалі яго незаконна. Таму лаянка зь яго боку была выкліканая незаконнымі дзеяньнямі міліцыі. Аднак лаяцца нельга. Таму — штраф. Сьведкі марна даводзілі суддзі, што спадар Воран грэбуе расейскай мовай і яе нецэнзурнымі „скарбамі".)

*3-га лістапада (запомніце гэты факт):* ***Алег Корбан***, 1985 года нараджэньня, быў дастаўлены ў РАУС Партызанскага раёну Менска за расклейку ўлётак. Ён паведаміў: „Міліцыянты, даведаўшыся, што я быў затрыманы, пачалі зьдзекавацца — білі па галаве. Потым павялі ў кабінэт для складаньня пратаколу. На сходах мяне ўдарылі нагой. У кабінэце пасадзілі ў крэсла, рукі паклалі на калені і сказалі, каб я не варушыўся. Майго *сябра* ***Міхаіла*** таксама пасадзілі ў крэсла. Да мяне падышоў міліцыянт, спытаў: „Колькі вам пляцяць?" Я адказаў: „Мы патрыёты, нам нічога ня трэба!" Ён пачаў біць мяне нагой і пасьля кожнага ўдару перапытваў, ці патрыёт я. Калі склалі пратакол, той жа міліцыянт зашчапіў мне прышчэпкай нос (а на ёй былі ключы розныя) і круціў, выклікаючы боль.

Другі міліцыянт, які зьдзекаваўся з Міхаіла, сказаў, што запісаў нашыя адрасы і паабяцаў, што зловіць нас каля хаты і даб'е, як жывёлу. Нас называлі брыдкімі словамі. Потым адзін сказаў: „Гэта вы на Першамайскай (дэманстрацыі?) мяне каменьнямі закідалі. Гэта былі вы, я вас запомніў. Гэта ты, лысы, я цябе даб'ю, як жывёлу!" Потым ён яшчэ раз ударыў мяне па галаве, і тут у кабінэт зайшла жанчына (інспэктар па справах непаўнагадовых **Шмыга**). У яе прысутнасьці міліцыянты працягвалі зьдзекавацца, сказалі, што сьпішуць на нас магнітолу, якая была некім скрадзеная. Потым міліцыянт ударыў мяне ў жывот з усяе сілы і сказаў, каб мы прызналіся, што ўзялі ўлёткі ў штабе БНФ „Адраджэньне". Білі нас. У той час, калі мы сядзелі там, нельга было варушыць рукамі."

***Міхась Царкоў***, 1986 года нараджэньня: „Міліцыянт сказаў: „Зараз мы вас адвязём у камэру катаваньняў, зашчэмім вам пальцы ў дзьверы, вы нам тады ўсё раскажаце". Потым убачыў у мяне на шыі крыж і сказаў: „Ах, ты яшчэ веруючы! Ты яшчэ ў гэтае г...но верыш!" Стаў зрываць зь мяне крыж. Другі міліцыянт падышоў да мяне, пачаў мне клеіць налепку на галаву, потым яшчэ біў нагамі і пытаўся, дзе бралі ўлёткі." Усё гэта адбывалася на вачах інспэктара па справах непаўнагадовых, жанчыны з прозьвішчам Шмыга.

*3 лістапада.* Намесьніца старшыні Зэльвенскага райвыканкаму (Горадзенская вобласьць) выставіла калектыву Зэльвенскай школы №3 ультыматум: калі там і надалей будзе выходзіць школьная газэта на беларускай мове ***„Дзярвяначка"*** (299 асобнікаў), то дырэктар школы будзе звольнены.

Газэта, як звычайная добрая школьная газэта. Палітыкі там няма. Усе артыкулы пішуць самы дзеці, самы газэту набіраюць, складаюць і друкуюць. Уся справа ў тым, што *газэта выходзіць па-беларуску* і выяўляе дзіцячае замілаваньне ды любоў да Беларусі, да роднай Зэльвы і людзей. Дырэктар школы ***Міхаіл Літвінчык*** прывівае дзецям любоў да Бацькаўшчыны Беларусі.

Гэтага ня можа сьцярпець прыбітая сіндромам лукашызму чыноўніца **Алена Коўш**, якая некалі была дырэктарам гэтае школы і пайшла адтуль у „вертыкаль", пакінуўшы школу ў брудзе і развале. Добра, што спадар Літвінчык справу паправіў. Дык вось жа круціць нешта вертыкальную асобу.

*3 лістапада.* Сябры *Беларускай Партыі Свабоды* наладзілі пікет каля амбасады Нямеччыны ў Менску супраць плянуемай анэксіі Беларусі Расеяй і супраць падрыўной антыбеларускай дзейнасьці нямецкага дыпламата **Ганса-Георга Віка**, які ўзначальвае Місію АБСЭ ў Менску.

У канцы верасьня ў Беластоку Ганс Вік агучыў нямецкую палітыку ў АБСЭ наступным чынам: *„АБСЭ на працягу апошніх шасьці гадоў вяла палітыку далучэньня Беларусі да Расеі, якая стала на шлях дэмакратызацыі, каб такім чынам дэмакратызаваць Беларусь".*

Ганс Вік ёсьць вопытным дыпляматам і мацёрым разьведчыкам, узначальваў зьнешнюю разьведку Нямеччыны. Ёсьць прыкметы супрацоўніцтва яго з рэжымам Лукашэнкі. На фоне агульнай нямецка-расейскай палітыкі ў Беларусі, гэта цалкам зразумела. Відавочна таксама, што не амбасадар Вінкельман кіруе нямецкай дыпляматыяй у Беларусі, а менавіта Ганс Вік.

На пікет Партыі Свабоды адразу накінулася зграя амапаўцаў. Пікет не далі магчымасьці прадаўжаць, рвалі плякаты, але нікога адразу не арыштавалі. Магчыма таму, што прысутнічала шмат журналістаў. Але, відаць, было дадзена ўказаньне не акцэнтаваць увагі на патрабаваньні беларускіх арганізацыяў выгнаць зь Беларусі нямецкага разьведчыка Віка.

*11 лістапада.* „Інтэлегенту цяжка прызнацца, што яму няма чаго есьці, але цяпер людзі прыходзяць і плачуць,— кажа старшыня Берасьцейскага абласнога прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Мікалай Коўш.— Многія ў адрас адміністрацыі самазванага прэзыдэнта адпраўляюць квіткі на зарплату." На Берасьцейшчыне пачаўся збор подпісаў пад заявай з эканамічнымі патрабаваньнямі настаўнікаў.

*12 лістапада ў Горадні* міліцыя змагалася з маладзёвай акцыяй. Было затрымана ***15*** удзельнікаў. Іх даставілі ў Ленінскі РАУС. На ўсіх, апроч трох непаўнагадовых, склалі пратаколы. Большасьць выпусьцілі, але чацьвёра былі пакінутыя „на начлег" у міліцыі, сярод іх — намесьнік кіраўніка суполкі Маладой Грамады ***Сьвятлана Нех.***

*12 лістапада* маладзёвая вулічная акцыя пратэсту ў Менску была

жорстка разагнаная міліцыяй. ***109*** чалавек трапілі за краты. Дэманстравалі ад 500 да 1000 чалавек, разганяла іх значна большая колькасьць міліцыянтаў і „гэб'я". Моладзь адмовілася ісьці на дазволены балотны Бангалёр і сабралася каля Акадэміі Навук. Потым рушыла па праспэкце Скарыны, страляючы пэтардамі. Перад самай плошчай Якуба Коласа шлях дэманстрантам перагарадзіў двайны заслон міліцыі са шчытамі, раўлі сірэны. „Амон" пачаў паляваньне на моладзь, малоцячы дубінкамі. У дварах „працавалі" міліцэйскія засады. Аўтобусы хутка напоўніліся затрыманымі. З вокнаў навакольных студэнцкіх інтэрнатаў за ўсім назіралі студэнты, крычалі міліцыянтам „фашысты!". Затрыманых развозілі па РАУСах. У пастарунках канвээрам складалі пратаколы аб ўдзеле ў несанкцыянаваным шэсьці і аб парушэньні грамадзкага парадку, здымалі на відэа-стужку. Журналістаў адпусьцілі раней. Непаўнагадовых адпусьцілі праз 2-3 гадзіны. Астатніх трымалі далей і зьбівалі. ***26*** чалавек з затрыманых правялі ноч у СІЗО на вуліцы Акрэсьціна. Сярод затрыманых не аказалася аніводнага з арганізатараў акцыі — ні Цімоха Дранчука, ні Паўла Севярынца, ні Алеся Чарняева.

Кагэбісты ў цывільным напалі на сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Тамару Сакольчык*** і яе сястру ***Ларысу***, калі тыя спрабавалі заступіцца за моладзь. Жанчынам на дапамогу прыйшлі прахожыя і „гэб'ё" адступілася.

У Барысаве разганяць несанкцыянаваны пікет прыехалі ўзброеныя аўтаматамі міліцыянеры.

Моладзь (у асноўным падлеткі) сабралася пад лёзунгам: „Пераменаў!" У час, калі Беларусь акупаваная, калі ўлада захопленая расейскімі спэцслужбамі і паволі гіне Бацькаўшчына, дзіцячы лёзунг „пераменаў!" гучыць даволі інфантыльна. Тым ня менш, рэжым кінуў на купку беларускай моладзі велізарныя сілы і вельмі жорстка расправіўся са студэнтамі і падлеткамі. *

*У Менску* асуджана ***17*** асобаў. У судзе Савецкага раёну: ***Андрэй Мазоўка*** *— штраф 20 мінімальных заробкаў (мін. з.);* ***Уладзімер Самончанка*** *— штраф 20 мін.з.;* ***Іван Цітовіч*** *— штраф 20 мін.з.;* ***Уладзімер Ткачэнка*** — папярэджаньне; ***Вольга Цімашук*** *— папярэджаньне;* ***Надзея Грачуха*** *— папярэджаньне;* ***Андрэй Юркавец*** *— 3 сутак адміністрацыйнага арышту;* ***Вталь Кошалеў*** *— папярэджаньне;* ***Уладзімер Лыско*** *— штраф 20 мін.з.;* ***Васіль Венярскі*** *— суд перанесены;* ***Кірыла Чулкоў*** *— папярэджаньне;* ***Яраслаў Мілашэўскі*** *— папярэджаньне;* ***Сяргей П'яных*** *— суд перанесены;* у судзе Першамайскага раёну: ***Сяргей Шмялёў*** *— суд перанесены;* ***Дзяніс Яроменка*** *— суд перанесены;* ***Руслан Харкевіч*** *— суд перанесены;* ***Юры Грыгор'еў*** *— папярэджаньне.*

*Горадня:* ***Іна Мялешка*** *— прысуд перанесены;* ***Сьвятлана Нех*** *— прысуд перанесены;* ***Вадзім Саранчукоў*** *— прысуд перанесены;* ***Андрэй Мельнікаў*** *— штраф 20 мін.з.;* ***Алесь Лашкоўскі*** *— у суд не зьявіўся ў сувязі з адмовай суддзі прадставіць перакладчыка;* ***Вольга Іванова*** *— прысуд перанесены;* ***Андрэй Мялешка*** *— штраф 30 мін.з.;* ***Натальля Капцэвіч*** *— штраф 20 мін.з.;* ***Вольга Філіповіч*** *— папярэджаньне;* ***Алена Машкала*** *— папярэджаньне;* ***Сяргей Клімук*** *— штраф 30 мін.з.;* ***Дзяніс Міхальчык*** *— штраф 30 мін.з.*

*Цікавая акалічнасьць.* Непаўнагадовых, што пахапаў „спэцназ" у Менску, завезьлі ў Першамайскі РАУС горада. Там пратаколы на іх пачала афармляць расейка, нейкая **Барадзіна С.Г.**, інспэктар па справах непаўнагадовых. Аказалася, што яна была п'яная (у выніку надмернага ўжываньня алькаголю); брудна лаялася па-руску і абзывала ўсіх прысутных брыдкімі словамі, у тым ліку і адвакатаў, якія там апынуліся, і бацькоў затрыманых дзяцей. Бацькі напісалі заяву ў пракуратуру на паводзіны п'яніцы.

*12 лістапада* жыхары Рэчыцы, што жывуць у мікрараёне завода *Рытм*, заўважылі на пад'ёмным кране на новабудоўлі — лунае *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг*. На гарадзкім рынку паўсюдна чырвонаю фарбаю было *напісана „Незалежнасьць!", „Жыве Беларусь!", „Пераменаў!", „Стоп, Лука!"* Надпісы зьявіліся цягам мінулай ночы і ў іншых месцах *Рэчыцы*.

*12 лістапада. Сьветлагорск*. У горадзе зьявіліся графіці ў падтрымку незалежнасьці і *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* — на будынку Сьветлагорскага індустрыяльнага тэхнікуму.

*12 лістапада* на Цэнтральны пляц *Барысава* выйшла група актывістаў філіі *Маладой Грамады*. Пікет быў несанкцыянаваны. Плякаты *(„Мы, беларусы, бяз братняй Русі!"; „Моладзь патрабуе пераменаў")* трымалі *17-гадовая* ***Алена Ясюк***, яе *14-гадовая* сястра ***Марына*** і *14-гадовы* ***Міхась Кузьняцоў***. Праз 2-3 хвіліны да іх пад'ехаў „крумкач", адкуль выйшаў нарад міліцыянтаў начале з капітанам **Белым**. Яны завалаклі падлеткаў у машыну. На ўсіх склалі пратаколы.

*12 лістапада.* Жодзінская моладзь таксама ня стала прасіць дазволу ўладаў на правядзеньне акцыі, якую яна адзначыла гэтай ноччу. У цэнтры горада моладзь усталявала на самых вышынных будынках некалькі *Бел-Чырвона-Белых* сьцягоў, а на шыльдах з назвамі вуліцаў „40 год кастрычніку", „50 год БССР" ды іншых прымацавалі іншыя назвы: ***„Імя Янкі Купалы", „Імя Якуба Коласа", „Імя Францішка Скарыны"***.

*12 лістапада. Бабруйск*. У ноч з пятніцы на суботу, пакуль бабруйскія міліцыянты сьвяткавалі дзень расейскай міліцыі, у 5-м і 6-м мікрараёнах зьявіліся намаляваныя фарбай лёзунгі *„Жыве Беларусь!"*. У наступную ноч надпісы зьявіліся і ў цэнтры Бабруйску.

*12 лістапада. Баранавічы.* На Ўсходнім мікрараёне Баранавічаў актывісты *Маладога Фронту* ў людным месцы вывесілі *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг.*

*14 лістапада* Міжнародная асацыяцыя Дзіцячых фондаў уручыла беларускай дзяўчынцы ***Сашы Гушчы*** адмысловы ордэн, адліты са срэбра і золата ў знак пакланеньня перад яе мужнасьцю і цярпеньнем. (У 11 месяцаў Саша страшэнна абгарэла і засталася без тварыка і пальцаў на абедзьвюх ручках. Сёньня ёй 14 гадоў, і яна перанесла больш за 30 пластычных апэрацыяў у Амэрыцы.

*15 лістапада, Віцебск.* ***Барыс Хамайда*** і ***Зьміцер Піменаў*** атрымалі па 150 „мінімалак" штрафу (500 даляраў) за несанкцыянаваны пікет БНФ *5-га* і *25-га кастрычніка.* Менавіта ў гэтыя дні яны былі затрыманыя міліцыяй за штодзённы збор подпісаў у абарону незалежнасьці Беларусі.

*15 лістапада* на *Зьміцера Піменава,* сябра Беларускага Народнага Фронту, распачалася крымінальная справа па арт.201 КК („хуліганства"). Яна, нібыта, тычыцца вытворча-бытавога канфлікту па месцы ягонай працы.

Падчас начнога дзяжурства 4-5 лістапада, пры выкананьні ім службовых абавязкаў вартаўніка, на яго быў зроблены напад. Абараняючыся, ён ужыў зброю. Але, відаць, ня тыя гэта былі зладзеі, што насьмеліліся самі выклікаць міліцыю. А тая, натуральна, затрымала ... З. Піменава. Хаца й ненадоўга. Цяпер замест парушальнікаў парадку, менавіта яго выклікае сьледчы на допыт.

Сам фронтавец падкрэсьлівае агрэсіўныя паводзіны нападаючых, якія не рэагавалі на ягоныя законныя патрабаваньні аб прад'яўленьні яму пропуску на ахоўваемы ім аб'ект.

*16 лістапада ў Сьветлагорску (Гомельская вобласьць)* адміністрацыйная камісія гарвыканкаму вынесла пастанову аштрафаваць на 5 мінімальных заробкаў ***Алеся Шавяленку*** і сябра *Маладой Грамады* ***Андрэя Понасава*** за тое, што хлопцы 6-га кастрычніка расклейвалі па горадзе абвесткі аб мітынгу ў падтрымку байкоту выбараў („без выходных дадзеных і парушалі санітарныя правілы").

***( Інфармацыйная Камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыіі — БНФ і прэс-служба БНФ.***
*Па матэрыялах Камісіі, СМІ, Вясны-96", SANA)*

* Некаторыя аналітыкі ў Народным Фронце выказваюць здагадку аб магчымай правакацыйнай задуме гэтай крыху дзіўнай у нашых акупацыйных абставінах акцыі. Рэжым імкнецца запалохаць і псіхалягічна зламаць беларускую моладзь, застрашыць падлеткаў. Адсюль нематываваная жорсткасьць і зьбіцьцё.

# БЕЛАРУСЫ ПАД АКУПАЦЫЯЙ:

## *Дзяцінства пад саветамі*

*(Успамінае Галіна Палачаніна, Менск)*

Лагойшчына — радзіма майго нябожчыка бацькі, мая Радзіма, маё маленства. Люблю прамаўляць гэтыя назовы вёсак, дзе жылі і працавалі бацькі-настаўнікі: Корань, Слабада, Янушкавічы, Стайкі.

У першы кляс я пайшла ў Крамянцы, а трэці скончыла ў вёсцы Моладзі. Школа, зразумела, усюды была беларуская.

Вучыцца вельмі любіла, і нават калі хварэла, уцякала на лекцыі, калі бацькі сыходзілі на працу.

А потым склалася так, што мы з мамай пераехалі жыць у Менск, і я пайшла ў 4-ы кляс 1-й менскай школы, побач зь якой мы тады жылі. Школа была руская.

Адразу пачаліся праблемы, бо раней я ўсе прадметы вывучала па-беларуску. Родная ж мова была беларуская, па-расейску ў нас на вёсцы ніхто не гаварыў. І я, зразумела, гаварыла па-беларуску. А тут трэба было гаварыць па-расейску.

Спачатку ў мяне не атрымлівалася. Аднаклясьнікі зь мяне сьмяяліся, гаварылі „деревня". А ў настаўніцы-расейкі мая мова выклікала страшэнны гнеў. Як цяпер памятаю яе сьціснутыя тонкія губы, порысты твар, як зваранная груша, і голас, заўсёды злосны, незадаволены, грубы. Яна высьмейвала мяне перад усім клясам, гаварыла, што „пара забыць свої деревенские прівычкі". І я адчувала сябе абсалютна безабароннай і няшчаснай.

З жудасьцю ўспамінаю, як яна прымушала ўсіх зьбіраць макулатуру па кватэрах, металалом — па гарадзкіх дварах. А чаго былі вартыя палітычныя піянерскія зборы, палітінфармацыі і іншыя недзіцячыя „мерапрыемствы"... Для мяне гэта была сапраўдная пакута, і аднаго разу ў нядзелю я не пайшла на нейкае піянерскае „мерапрыемства".

Назаўтра, страшна лаючыся, яна загадала клясу аб'явіць мне байкот: усім клясам не размаўляць са мной. Але і гэтага падалося мала, і яна падбухторыла дзяцей „проучіць деревню". Пасьля заняткаў, памятаю, на мяне накінулі паліто і білі...

Самыя вялікія непрыемнасьці былі на „ўроках" рускай мовы, якая ў раскладзе была кожны дзень. Я была як зацкаваная і клясам, і настаўніцай. І ці то ад страху, ці то ад разгубленасьці, але як толькі мяне выклікалі да дошкі, я зноў і зноў гаварыла „назоўнік", „прыметнік", „дзеяслоў", замест „существительное", „прилагательное", „глагол". І сама ўжо ведала, і мама дома сотні разоў мяне вучыла (яна была настаўніцай), але як толькі я чула „Палачаніна, к доске", то там, на гэтым „лобным месцы" я, як заварожаная, паўтарала зноў усё па-беларуску. „Цярпеньне" ў маёй настаўніцы скончылася хутка. Яна называла мяне дурніцай, іншымі абразьлівымі словамі. І кожны дзень я чула ад яе зьнявагі і пагрозы, што мяне перасадзяць у трэці кляс. На перапынках я звычайна хадзіла адна, бо з „деревней" ніхто не хацеў дружыць: адносіны настаўніцы ўплывалі на 10-гадовых маіх аднагодкаў. Школа, якую я так любіла раней, ператварылася для мяне ў сапраўдную пакуту, я ўзьненавідзела яе ўсёй сваёй перапужанай дзіцячай душой.

Потым, праз нейкі час, я засвоіла „гарадзкую" мову і стала, — як усе...

Прайшоў час. Я скончыла школу, філялягічны факультэт, асьпірантуру. Адным словам, была ні ад каго не залежным чалавекам, дэпутатам Менгарсавета.

І вось неяк ў 1994-м годзе я кудысьці ехала. Зайшла ў тралейбус. І раптам мяне як варам акаціла, я застыла на месцы, стаяла як спаралізаваная і не магла паварушыцца. У некалькіх кроках ад сябе я ўбачыла яе, гэтую рускую настаўніцу. І хоць мінула больш трыццаці гадоў, яна амаль не зьмянілася, толькі пастарэла. Такі ж злосны недабразычлівы порысты твар, такія ж сьціснутыя губы... Страх і жудасьць, як і ў тыя дзіцячыя гады, ахінулі ўсю маю істоту. На імгненьне мне стала дрэнна.

Праз хвіліну, выдыхнуўшы паветра, я рассьмяялася сама сабе: якое глупства. Толькі падумалася: „Як гэта страшна ня быць у сваім доме — гаспадаром."

А зараз, пад уплывам сёньняшніх страшных падзеяў ды людабойства, якое зьдзяйсьняюць расейскія бандыты ў Чачэніі, думаецца: „Вось ён зьмест гэтай палітыкі: „существительное" ды „глагол".

## *Беларускія жанчыны*

*(Успамінае Рагнеда Аляхновіч, Менск)*

Я ўспамінаю глыбокую восень 1944 года, дарогу зь Вялейкі ў Іжу. Мама мая, Ксеня Грышкевіч, сядзела за нацыяналізм у савецкай турме, а мною апекаваліся яе сёстры, Настуля і Ніна. Я вучылася ў Вялейцы ў 7-й клясе, а вакацыі праводзіла то ў адной, то ў другой цёткі. На „кастрычніцкія сьвяты" па мяне на сваім кані прыехала Ніна. Асеньні дзень кароткі, і каля маёнтку *Любань* нас засьпела ноч. Павярнулі нацянькі, на лясную дарогу. Ляскоча кола па карэньні, месяц ледзь сьвеціць праз галіны дрэў. Страшна, вусьціжна.

Даехалі да броду праз раку *Вузьлянку*, і конь стаў, як укопаны, бо ваду зацягнула ільдом. І ні просьбы, ні грозьбы не дапамаглі.

Тады цётачка ськінула зь сябе кажух ды боты і пайшла ў раку. Ступіць крок, наляжа на лёд, паламае, разгорне рукамі — і так да другога барага. А я сяджу на возе, моцна трымаю лейцы ды плачу.

Перавяла яна каня з калёсамі праз брод, укінулася ў воз, нацягнула кажух, боты. Як мы даімчалі да іжанскіх хутароў — ня памятаю. Калі цётку Ніну распранулі — усё яе цела было ў сіняках і шнарах.

Доўга яна хварэла потым, ды ўсяроўна мусіла сама гадаваць дачку, даглядаць гаспадарку, бо дзядзька Аляксей зь верасьня 1939 году быў у нямецкім палоне.

І вось праз дзясяткі гадоў, успамінаючы гэты выпадак, я задумалася. Што ж гэта было: гераізм, ці проста — жыцьцё беларускай жанчыны?..

# СТАРЫЯ ДАРОЖКІ

Людзі любяць размаўляць пра палітыку, крытыкаваць дзеяньні ўлады, стараюцца зразумець становішча і прычыны падзей. Тым часам шмат якія падзеі і зьявы маюць пастаянную тэндэнцыю і пастаянны характар пераменаў, паўтараюцца з году ў год і нават — зь веку ў век, існуюць стагоддзямі. Асабліва ў зьнешняй палітыцы, якая моцна ўплывае на ўнутранае наша жыцьцё.

Значыць, існуюць пастаянныя прычыны такіх тэндэнцыяў. Гэтыя прычыны абумоўленыя, перш за ўсё, балянсам сілаў і парадкам у сьвеце.

Тэндэнцыі сьветабудовы ў Эўропе не зьмяняюцца ўжо тысячы гадоў і ўзьніклі яшчэ за часы Рымскай імпэрыі. Яны выяўляліся ў сутыкненьні цывілізацыі і варвараў, пазьней — Захаду і Ўсходу, у супроцьстаяньні ўзаемных экспансіяў.

Тым часам парадак дачыненьняў зьмяняўся некалькі разоў за гісторыю, у залежнасьці ад разьмеркаваньня сілаў у гэтых тэндэнцыях.

У позьнім сярэднявеччы (а менавіта ў XIV-XVII стагоддзях, якія мы, беларусы, называем для сябе „Залатым векам") балянс тэндэнцыяў на Ўсходзе Эўропы у значнай ступені вызначаўся існаваньнем *Вялікага Княства Літоўскага* і пазьней — *Рэчы Паспалітай.*

Моцная славянская краіна распрасьціралася ад Балтыйскага да Чорнага мора і трымала пад кантролем ўвесь Усход Эўропы. Вялікае Княства выконвала тут стабілізуючую ролю. Дзяржава ўзьнікла на старажытным міжморскім шляху і амартызавала дзьве ўзаемавыключаючыя экспансіі: цывілізацыйную з Захаду і варварскую — з Усходу.

Пасьля распаду Рымскай імпэрыі цывілізацыйную функцыю зьяднаньня Эўропы і пашырэньня яе на Ўсход узялі на сябе немцы. На Ўсходзе, пасьля распаду Залатой Арды, разбуральную варварскую экспансію на Захад пераняла Масковія.

На працягу стагоддзяў старажытная беларуская цывілізацыя трымала ўдары з Усходу і з Захаду, пільнуючы пэўны парадак у гэтай частцы Эўропы. Стабілізуючая роля нашай краіны, аднак, паступова малела, разам з заняпадам магутнасьці Вялікага Княства. Заключэньне Люблінскай Уніі з Польшчай і ўтварэньне Рэчы Паспалітай не ўратавала становішча, бо прывяло да аб'яднаньня нямецка-расейскіх інтарэсаў. Антаганісты з Захаду і з Усходу не хацелі існаваньня Рэчы Паспалітай, кожны імкнуўся ўступіць на тэрыторыю, што ляжала паміж інтарэсамі.

Менавіта немцы, ажыцьцяўляючы свае пляны, прычыніліся ў XVIII стагоддзі да арганізацыі і росту магутнасьці Расейскай імпэрыі. Лёс Рэчы Паспалітай быў вырашаны. У канцы XVIII стагоддзя яна перастала існаваць.

Адбылася кардынальная перамена становішча і парадку ў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе. Становішча стала нестабільным, бо дзьве экспансійныя лініі адвечнага цывілізацыйнага канфлікту сустрэліся „твар у твар" і выйшлі на агульныя межы.

Глябальнае ваеннае сутыкненьне паміж імі стала непазьбежным, але адбылося яно толькі праз сто гадоў (у 1914-м), таму што спатрэбілася яшчэ сто гадоў, каб палітычна пераварыць Беларусь, Польшчу, Летуву і Ўкраіну, ды задушыць чатыры паўстаньні.

Пасьля сканчэньня 1-й Сусьветнай вайны міру фактычна не наступіла. Гэта была толькі перадышка, бо нестабільнае становішча ў Цэнтры і на Ўсходзе Эўропы, створанае пасьля разбораў Рэчы Паспалітай, яшчэ больш абвастрылася. Беларусь падзялілі, а з існаваньнем незалежнай Польшчы ніхто сур'ёзна не лічыўся. Немцы і рускія (то бо Гітлер і Сталін) праводзілі ўзгодненую палітыку.

У 1939 годзе яны зноў сумесна вышлі „твар у твар" на лінію Керзона — часовы геапалітычны падзел. Вайна запалала ізноў.

Ялцінскі эўрапейскі парадак, які ўзьнік пасьля 2-й Сусьветнай вайны, гэта ёсьць той самы парадак, што стварылі пасьля разбораў Рэчы Паспалітай у канцы XVIII стагоддзя, толькі папраўлены цяпер Злучанымі Штатамі Амэрыкі, якія ўзялі на сябе ролю стрымліваючага фактару.

У 1991 годзе, калі часткова распаўся Савецкі Саюз і аднавіліся незалежныя краіны Ўсходняй Эўропы, тады зьмянілася і пасьляялцінская сітуацыя, і ўпершыню за 200 гадоў гісторыі ўзьнікла магчымасьць аднавіць Усходнюю Эўропу паміж Балтыкай і Чорным морам як цывілізацыйны фактар, адрадзіць на новым, незалежным узроўні, той, больш надзейны парадак, які існаваў два стагоддзі таму.

Але аказалася, што ня так гэта проста. Аказваецца, шмат каго ўзнэрвавала пэрспэктыва Балта-Чарнаморскага адзінства ў Эўропе. Аказалася, што зноў сталі супрацоўнічаць старыя сябры-ворагі немцы-рускія, зноў гандлююцца за Беларусь з Расеяй. А нядаўна нямецкі дыплямат у Беларусі Ганс-Георг Вік (былы кіраўнік зьнешняй разьведкі Нямеччыны) так і заявіў у Беластоку, што нямецкая палітыка ў АБСЭ спрыяе ўключэньню Беларусі ў склад Расеі. Выяўляецца, што яны ўжо зноў таемна падзялілі Ўсходнюю Эўропу пад прыкрыцьцём размоваў аб „правах чалавека".

Яны зноў інтэгруюцца. На Ўсходзе — хочуць вялікадзяржаўнай Расеі; на Захадзе — аб'яднанай Эўропы. Хто хоча дамінаваць на Ўсходзе — зразумела. Хто ў Заходняй Эўропе — таксама зразумела. (Калі ня немцы, то Дойчэ Банк.)

Гэтак фармальныя абставіны і пэўныя расстаноўкі сілаў на старым кантынэнце ўплываюць на „старыя дарожкі" старых дачыненьняў.

Мушу сказаць, што гэтая змора, гэты кашмар нямецка-рускай палітыкі ўжо стагоддзямі вісіць над Беларусяй і Польшчай. Сітуацыя, якая зноў адраджаецца цяпер, ужо (як мы бачылі) была ня раз і вядзе яна зноў да старога цывілізацыйнага канфлікту, разьвіцьцё якога можа рэальна пачацца, калі давядуць да інкарпарацыі Беларусі ў Расею.

Ведаючы правілы гісторыі і назіраючы цяперашнія працэсы ў нашай частцы сьвету, мы бяз цяжкасьці зразумеем, што Заходняя Эўропа — вельмі ненадзейны памочнік Беларусі ў яе беларускай нацыянальнай драме. Дамінацыя нямецкай палітыкі тут штораз павялічваецца, узаемадзеяньне Нямеччыны з Расеяй ёсьць гістарычна і сітуацыйна угрунтаванае, палягае на ўзаемных антаганізмах і агульных інтарэсах. Яны ўжо вызначаюць лёс Усходняй Эўропы: Беларусь — пад Расею, Польшчу — у Эўразьвяз.

Дзьве высновы напрошваюцца з таго, што ёсьць. Першая — гэта тое, што наша галоўнае спадзяваньне павінна быць спадзяваньнем на самых сябе. Наша сіла — у нас самых.

Другая выснова ў тым, што пэрспэктыва Беларусі зьлепшала б, калі б у новай расстаноўцы зьявілася трэцяя сіла. Сто гадоў таму не было такой сілы. Цяпер гэта можа быць Амэрыка.

Сёлета распачынаецца чарговая палітычная бітва за Беларусь. У яе, магчыма, уключыцца і Амэрыка. Але ізноў жа, не забывайма: вырашае ні Амэрыка, ні Масква і ні Брусэль. ***Вырашае Беларусь і Беларускі Народ***.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

# КАНФЭРЭНЦЫЯ

*18 лютага ў Менску* адбылася вялікая Соймавая канфэрэнцыя *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*. Присутнічала больш за 200 сяброў абодвух Соймаў і кіраўнікі арганізацыяў. Зь вялікім, амаль двухгадзінным палітычным дакладам (***Беларускі Вызвольны Рух — альтэрнатыва расейскай акупацыі і палітыцы нацыянальнай здрады"***), выступіў ад кіраўніцтва Партыі і Руху выконваючы абавязкі Старшыні дэпутат Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня ***Юры Беленькі***.

У прэамбуле даклада адзначана:

*"Сёньняшняя канфэрэнцыя Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ мае надзвычай важнае тэарэтычнае, палітычнае і практычнае значэньне. Гэта першае мерапрыемства такога ўзроўню, што праводзіцца пасьля IV Зьезду Партыі БНФ (на якім была прынятая новая Праграма Партыі, новая рэдакцыя Статуту і ўдакладненая назва Партыі — Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ) і пасьля другой сэсіі VI Зьезду Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне", дзе было арганізацыйна афармленае размежаваньне ў Фронце.*

*Гэтым годам мусяць адбыцца выбары прэзыдэнта Беларусі. Нам давядзецца прымаць найважнейшыя палітычныя рашэньні. Для таго, каб рашэньні былі правільныя, трэба рупіцца пра іх адпаведнасьць палітычнай лёгіцы нашага змаганьня і абавязкова клапаціцца, каб яны былі зразумелыя і прымальныя для сяброў нашай арганізацыі. Таму на канфэрэнцыі ёсьць неабходнасьць зьвярнуцца яшчэ раз да пераломных момантаў найноўшай гісторыі Беларусі, каб зрабіць тэарэтычнае падсумаваньне і сістэматызаваць тыя палітычныя і тактычныя дзеяньні, якімі кіраваўся Фронт цягам 12-ці гадоў свайго змагарнага чыну.*

*Сіла і выверанная палітыка Фронту былі і застаюцца рэальнай альтэрнатывай расейскай акупацыі і палітыцы нацыянальнай здрады. Нам трэба знайсьці эфэктыўныя захады па ліквідацыі прамаскоўскага рэжыму Лукашэнкі, які ёсьць асноўнай прычынай нацыянальнай і этнічнай катастрофы, перад якой апынуліся беларусы.*

* * *

*Сёньня Беларусь стаіць перад жорсткім выбарам: ці канчаткова застацца ў палітычнай і каляніяльнай залежнасьці ад Расеі, ці змагацца і адбудоўваць незалежную дэмакратычную дзяржаву ў Эўропе. Ёсьць два супрацьлеглыя шляхі.*

*Адзін шлях — і гісторыя яго паказала — гэта шлях нацыянальнага прыніжэньня, эканамічнай адсталасьці і духоўнай дэградацыі, страта ўласнасьці, незалежнасьці і свабоды.*

*Іншы, лепшы шлях — гэта ліквідацыя дыктатарскага рэжыму, змаганьне з расейскім імпэрыялізмам і пэрспэктыва нацыянальна-культурнага адраджэньня, эканамічнага дабрабыту і грамадзкага спакою.*

*На першы шлях спрабуе скіраваць нас Масква і ейныя памагатыя ў Беларусі. За другі шлях змагаецца Беларускі Вызвольны Рух і яго галоўныя арганізацыі — Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ.*

*Тая палітычная барацьба, што адбываецца на Беларусі пры ўдзеле Фронту цягам апошніх 12-ці гадоў, гэта ёсьць змаганьне за адраджэньне Беларускай ідэі, за існаваньне Беларускай нацыі, за сьцверджаньне незалежнай Беларускай дзяржавы. У гэтым сутнасьць. Усё астатняе альбо выяўляе гэтую сутнасьць, альбо супроцьпастаўляецца ёй у самых разнастайных формах — ад акупацыйнага рэжыму да каляніяльнай апазыцыі."*

Прааналізаваўшы становішча ў Беларусі, дэлегаты Соймавай канфэрэнцыі прышлі да высновы, што „*Беларускі Вызвольны Рух* мусіць выставіць кандыдата дзеля змагарнай альтэрнатывы і палітычнай барацьбы за вольную Беларусь.

***Канфэрэнцыя зьвярнулася да Зянона Пазьняка з прапановай прыняць удзел у выбарах прэзыдэнта ў якасьці кандыдата ад Беларускага народа.***

Акрамя таго Соймавая канфэрэнцыя прыняла рашэньне, дзе дакладна вызначыла задачы і абавязкі сябраў Партыі ў выбарчай кампаніі. *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* і *Народны Фронт* арганізуюць сістэму назіраньня за ходам галасаваньня.

Сябры Партыі не павінны ўваходзіць у іншыя групы назіральнікаў.

***Пётра ЯНОВІЧ***

**ЗЯНОН ПАЗЬНЯК**

***(Ліст на Соймавую канфэрэнцыю Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ)***

# ЗА БЕЛАРУСЬ

...Надыходзіць крытычны час для рэжыму. Ёсьць шанц для Беларусі. Нельга дапусьціць, каб антыбеларускія сілы: Масква, Лукашэнка і ягоная „апазыцыя" — зноў пакарысталіся народам для дасягненьня сваіх эгаістычных інтарэсаў.

Мы і ўвесь *Беларускі Вызвольны Рух* мусім удзельнічаць у выбарах ***з мэтай палітычнай барацьбы ад імя ўсёй Беларусі і ўсяго Беларускага Народа***. Гэта наш абавязак, бо мы ўзялі на сябе адказнасьць выяўляць інтарэсы беларускага чалавека, інтарэсы ўсёй Беларускай Нацыі. І мы выяўляем гэтыя інтарэсы. Мы маем маральна-палітычнае права прадстаўляць Беларускі Народ, бо мы ёсьць ягоная частка, якая ахвяравалася для яго. Мы незалежныя ад Усходу і ад Захаду, бо не бярэм іхных сродкаў. Мы не бярэм падачак ад чужых. Мы палітычна дзейнічаем за кошт нашых унутраных рэсурсаў і абапіраемся на падтрымку свайго народу.

Мы разумеем, што ***нармальных выбараў ня будзе***. Ні Лукашэнка, ні Масква, што за ім стаіць, не дапусьцяць паражэньня, бо разумеюць, што страцяць ўсё, скончыцца іхняя ўлада, мафійныя грошы і акупацыйная палітыка, спыніцца імпэрская „інтэграцыя". ***Выбары будуць заведама сфальсіфікаваныя пры любым раскладзе.*** Асобы, што зьбіраюцца ўдзельнічаць у выбарах побач з дыктатарам і наіўна спадзяюцца ў гэтай сітуацыі лічыць свае галасы, ня маюць ніякіх шансаў. Яны патрэбныя Маскве і Лукашэнку дзеля бачнасьці, каб сказаць, што „выбары" быццам бы былі „дэмакратычнымі".

Фактычна, гэтыя асобы ўдзельнічаюць у сцэнары Лукашэнкі і спрыяюць яму.

У палітычнай барацьбе мы павінны ўлічваць ўсіх і выкарыстоўваць тых, хто выступае супраць нашых палітычных праціўнікаў. На гэтым грунтаваліся нашы неаднастайныя адносіны і да асобаў чужой нам так званай „аб'яднанай апазыцыі".

Але калі пачынаюцца выбары, то мы павінны рабіць жорсткі і адназначны выбар. Рознастайнасьці тут ужо не існуе і ня можа быць.

Мы павінны выразна ўсьвядоміць, што ў гэтай сітуацыі, калі разыгрываецца адзіны маскоўска-лукашэнкаўскі сцэнар, ***усе кандыдаты з так званай „аб'яднанай апазыцыі" ёсьць (гэтак жа, як і Лукашэнка) нашымі палітычнымі праціўнікамі. Лукашэнка і яны — гэта ёсьць для нас ў створанай сітуацыі адна варожая нам каманда. Мы мусім змагацца зь ёй.***

Заўважце, што там зьбіраюцца ўсе былыя (што супрацоўнічалі з Лукашэнкам). *Беларускі Народны Фронт,* які дамогся незалежнасьці Беларусі, спыніў тут дзейнасьць КПСС і ЛКСМБ, ніколі ня быў разам і не супрацоўнічаў з такімі намэнклятурнымі асобамі, як **Чыгір**, **Ганчарык**, **Домаш**, **Лукашэнка**, **Лябедзька**, **Булахаў**, **Сініцын**, **Фядута**, **Багданкевіч**, **Казлоўскі** і г.д. Гэтая былая намэнклятура называецца цяпер „аб'яднанай апазыцыяй". Раней яны абаранялі камуністычную сістэму. Яны заўсёды выступалі супраць беларускай нацыянальнай ідэі і супраць *БНФ* (і выступаюць непрыхільна па сёньняшні дзень). Яны падтрымлівалі Кебіча, Сакалова, Малафеева і Лукашэнку і заўсёды схіляліся перад Масквой. Вось і цяпер яны езьдзяць туды прасіць грошай і падтрымкі. Яны не зьбіраюцца выступаць супраць расейскай акупацыйнай „інтэграцыі" і супраць расейскай імпэрскай палітыкі на Беларусі. То навошта яны ідуць на выбары?!

Адказ просты: каб захаваць існуючую ўладу (у тым ліку, і прамаскоўскі рэжым), але зьмяніць Лукашэнку. Дзеля гэтага яны і шукаюць падтрымкі ў Крамля.

***Мы выходзім на выбары з задачай змаганьня за вольную незалежную Беларусь, за годнасьць, свабоду і дабрабыт беларуса.*** Прэч расейскі імпэрыялізм! Беларусь для беларусаў, а не для маскоўскай імпэрыі і маскоўскай мафіі. Гаспадарамі на Беларусі будзем мы, беларусы, а не маскоўскі ФСБ. ***Мы*** будзем валодаць нашай нацыянальнай уласнасьцю, маёмасьцю, зямлёй і гаспадаркай, а не маскоўскія крымінальныя алігархі. ***Мы*** будзем мець дабрабыт з нашай беларускай зямлі і з нашай працы, а не маскоўскія акцыянэры!

Ніхто ня будзе больш зачыняць нашыя беларускія школы і спальваць беларускія падручнікі, ніхто ня будзе больш пляваць на нашу беларускую мову і прымушаць нас гаварыць па-руску. Мы спынім зьдзек над беларусамі.

Не правы чалавека — галоўнае для беларусаў, а незалежнасьць і свабода, бо няма „правоў чалавека" пад акупацыяй.

І з палітычнага, і зь юрыдычнага боку няма ніякіх перашкодаў для кандыдата ад *Вызвольнага Руху* ды ад Беларускага Народу. Мы не павінны будзем у гэтым сэнсе зьвяртаць увагу на дэмагогію розных тлумачэньняў. ***Права нам дае само жыцьцё, беларуская гісторыя, беларускі народ і беларуская Канстытуцыя.*** Мы мусім зыходзіць з гэтага права. І што б ні рабіў рэжым, ламаючы наша права, мы павінны ісьці сваёй упэўненай дарогай праўды.

***Беларускі Вызвольны Рух ёсьць альтэрнатыва акупацыйнаму рэжыму і ўсёй прамаскоўскай каляніяльнай палітыцы на Беларусі.*** Мы павінны даць народу выбар ў любой сітуацыі, нават у самай неспрыяльнай. Нават калі рэжым створыць найгоршыя ўмовы і ў бюлетэні для галасаваньня ня будзе стаяць прозьвішча альтэрнатыўнага кандыдата, то мы павінны працаваць у такім накірунку, каб і ў гэтым выпадку людзі маглі выбіраць паміж усімі тымі, хто ў бюлетэні (якіх трэба выкрэсьліць), і рэальным кандыдатам Беларускага Народа. (Хоць бы яго Лукашэнка і не дапусьціў бы да выбараў.) Усяроўна выбар павінен адбывацца паміж беларускім

кандыдатам ад *Вызвольнага Руху* і Лукашэнкам. Бо рэальная альтэрнатыва каляніяльнаму рэжыму ёсьць, канкрэтная кандыдатура — існуе.

Калі ў антызаконных умовах, створаных рэжымам, такі выбар адбудзецца, гэта будзе азначаць палітычную перамогу над Лукашэнкам і Масквой. Палітычная перамога неўзабаве стане і перамогай рэальнай.

Мы зацікаўленыя, каб галасаваць прышло як найбольш выбаршчыкаў. Тады цяжэй сфальсіфікаваць выбары.

Мы павінны наладзіць татальны і шчыльны кантроль над галасаваньнем.

Шмат дзеяньняў чакае нас наперадзе: і палітычнага, і тэхнічнага кшталту. Сёньня мы павінны ўсьвядоміць для сябе важнае. Гэта тое, што мы абавязаны ўключыцца ў выбары ***з мэтай палітычнага змаганьня за вольную незалежную Беларусь***. І другое — гэта тое, што наша палітычная пазыцыя вельмі моцная. Задача — правільна і пасьпяхова яе рэалізаваць.

У бліжэйшы час мы мусім зьвярнуць дастатковую ўвагу на тэхнічную падрыхтоўку і прапаганду.

Сябрам *Беларускага Вызвольнага Руху* неабходна заўсёды памятаць ужо вядомыя высновы:

**1.** Эўропа пры пэўных умовах гатовая прызнаць несправядлівыя выбары, і нават заплюшчыць вочы на фальсіфікацыі. Нельга гэтага дапусьціць.

**2.** Лукашэнка мае магчымасьць сябе пакінуць на вяршыні ўлады. Аднак, пры ўмове існаваньня беларускай альтэрнатывы і непрызнаньня выбараў міжнароднай супольнасьцю, ён доўга не пратрывае. Яго папулісцкі рэсурс скончыўся. Пры такім варыянце — гэта таксама наша перамога.

**3.** Найгоршая сітуацыя — калі Масква выпхне на прэзыдэнта замест Лукашэнкі іншага свайго стаўленіка.

Тут можа ўзьнікнуць ня толькі „чорт з табакеркі", але і подкуп любога намэнклятурнага прэзыдэнта з „дэмапазыцыі" (іхняя здольнасьць прадавацца добра вядомая).

Паважаныя сябры, мы павінны дакладна назіраць. Нельга дапусьціць афёры зь беларускім Каштуніцам. Гэта якраз трэці варыянт, самы небясьпечны для Беларусі...

*18 лютага 2001 г.*
*Нью-Ёрк*

# ПРЭЧ!

*27 студзеня ў Віцебску* прайшоў пікет з лёзунгамі: ***„Прэч расейскіх акупантаў!"***. Арганізатары — сябры суполкі *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ Кастрычніцкага раёну Віцебска.*

Старшыня суполкі *Пётра Сырапеня* сказаў: „На сёньняшні дзень у дзеючым урадзе ды вярхоўных структурах улады практычна не засталося ніводнага беларуса. Вядуцца этнічныя зачысткі, замест беларусаў на пасады ставяцца выхадцы з Расеі ды супрацоўнікі расейскіх спэцслужбаў". (Так было напісана ў заяве арганізатараў пікету.)

Пікетоўцы — ***Пётра Сырапеня, Ігар Марозаў, Валеры Апокін*** *і інш.*— раздавалі ўлёткі *Беларускага Вызвольнага Руху* ды артыкулы *Зянона Пазьняка*.

Аздобай быў *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* ды адмысловы інфармацыйны стэнд з прозьвішчамі **Замяталіна**, **Латыпава**, **Ярмошына**, **Сівакова**, **Стражава**, **Чыкіна** і інш., якія былі адзначаны як сапраўдныя здраднікі беларускай нацыянальнай ідэі ды яўныя расейскія паслугачы.

Кідаўся ў вочы надпіс: „*Прэч зь Беларусі расейскую каманду КГБ-ФСБ, якая з дапамогай Лукашэнкі акупавала ўладу!"*

Адметна, што амаль ніхто з наведвальнікаў пікету гэтую заяву абвяргаць ня стаў. Толькі адна жанчына, падкрэсьліўшы сваё расейскае паходжаньне, сумна заўважыла, што беларусы самы ня мусяць быць такімі адданымі Лукашэнку, каб падчас новых выбараў ізноў ня стаць закладнікамі імпэрскае расейскае палітыкі.

Пікет наведалі больш за 100 чалавек.

***(Б.Станкевіч. Паводле радыё „Свабода")***

# МІРОН У ЛЁЗЬНЕ

Лёзна. 31 сьнежня, як звычайна, „начальнік усяе Беларусі" за 15 хвілінаў да поўначы меў намер зьвяртацца да народу з навагодняй прамовай.

Але сьвяточных навагодніх віншаваньняў ад „усенароднаабранага" жыхары Лёзна так і не дачакаліся. Трансьляцыя БТ ішла добра да таго часу, пакуль не зьявіўся на экранах Лукашэнка. Як толькі ён адчыніў рот, каб зрабіць віншавальную прамову, адразу на экранах тэлевізараў пайшлі шырокія палосы й зьнік гук. Але, як толькі ён скончыў, усё зьявілася. І гук, і бачнасьць.

Стала вядома, што „прамоўцу" адключыў Мірон. Бо надта ж надаелі ў Лёзьне прамовы Лукашэнкі.

4 студзеня прыязджалі прадстаўнікі спэцслужбаў, каб запэленгаваць крыніцу электрамагнітных перашкодаў. Але нічога не знайшлі.

***Б. ХАМАЙДА***

# „ПРАВОСЛАВИЕ ИЛИ СМЕРТЬ!"

## *Віднае месца*

У Менску гэта самае віднае месца. Ці з Камароўкі, ці з высачэзнага Дому модаў, ці з „Чортавага кола" ў Чэлюскінцах, ці з „Рэзыдэнцыі яго...". Адусюль відаць гэтыя два дамы за Філярмоніяй, на горцы. У адным з тых „міністэрскіх" дамоў колькі год таму разьмясьцілася кнігарня. Аршынныя літары „Православная книга" і адпаведны вялізны крыж на фасадзе недвухсэнсоўна паведамляюць, хто ў доме гаспадар. У тую кнігарню на вуліцу Берасьцянскую,17 запрашае і рэкляма ў мэтро, і абвесткі па І-м „нацыянальным" канале БТ. Хто плоціць — той і замаўляе музыку.

Кнігарня, поўная літаратуры з манархічна-імпэрскім, расейска-шавіністычным душком ужо „праславілася" продажам антысэміцкае кнігі „Война по законам подлости". Габрэйскія арганізацыі засталіся, фактычна, сам-насам з гэтай ваяўнічай „Православной инициативой" (так завецца арганізацыя-выдавецтва — уладальнік кнігарні па вул. Берасьцянскай,17). Суд ня толькі ўхіліўся ад пакараньня выдаўцоў-прадаўцоў, але й назваў гэтую кніжэнцыю „научным исследованием", „научной точкой зрения". Толькі чаму навучыць такая „навука"?

Тамсама, побач з кнігамі пра „нашего нового страстотерпца" бацюхну-цара Мікалая-ІІ, ляжыць кніга „**Черная сотня**", дзе, не сумняваймася, адбельваецца дзейнасьць гэтай арганізацыі („исключительно с научной точки зрения").

А тым часам кнігарня „Православная книга" ўпрыгожыла свае паліцы новым „шэдэўрам" — часопісам з дзіўнай назвай: **„Православие или смерть!"**

## *Імпарт нянавісьці*

Беларускі кніжны рынак затоплены рускай друкаванай „маспрадукцыяй". Нават дзіцячыя кніжкі — ўсе рускія.

Прадукт пад №14, завезены з Масквы ў менскую кнігарню на вул. Берасьцянскай, прыводзіць у здранцьвеньне. Гэта не дзіцячыя казачкі. Чатырнаццаты нумар часопіса „Православие или смерть!" называецца

... **„Черная сотня”**. Вядома, як чарнасоценцы змагаліся за „православие” і хто арганізоўваў габрэйскія пагромы.

Прывядзем толькі назвы і тэматычныя подпісы некаторых папярэдніх нумароў гэтага часопісу, зьмешчаныя на апошняй старонцы вокладкі: **„Масонство, Ватикан, Всемирный Совет Церквей” (Заговор мировой закулисы против Церкви Христовой)”**; **„Падение в бездну экуменизма”**; **„XX век. Россия. Христос” (Приближается к своему концу многовековое противостояние отступнического Запада православной России)”** і г.д.

(Апошняе абсурднае „тлумачэньне” пра „отступнічеcкий” Захад ня лічыцца з тым, што на тэрыторыі Расеі нават гарады ўзьнiклі толькі ў XII стагоддзі, а Расея сталася яшчэ пазьней. Ды й Хрысьціянства прыйшло сюды толькі праз 1000 гадоў свайго існаваньня.)



*Вокладка альманаха “Православие или смерть”№14*

Гэта ўжо сапраўдны імпарт нянавісьці, нянавісьці да ўсіх іншых — да каталікоў і пратэстантаў, да Захаду і „черных”, да ўсяго інакшага ад „сьвятой Русі” сьвету. Крыніцай такой прапаганды, відавочна, зьяўляюцца расейскія шавіністычна-манархічныя колы. (Але што казаць пра рэакцыйныя колы, калі замест прапагандаваньня Эвангельля, міру і любові, сам Маскоўскі патрыярх Алексій II „асьвячае” самалёты, якія палятуць бамбаваць вёскі ў Чачэніі...)

Ёсьць і такая назва: **„№13 „Как обмануть церковь” (Антицерковная деятельность Митрополита Филарета (Вахрамеева)”**. Гэта значыць Мітрапаліта Менскага.

Вось гэта „православная инициатива”, вось гэта напор!

Відавочна, рускія імпэрскія колы бачаць небясьпеку для свайго панаваньня ня толькі ва ўзьнікненьні незалежнай ад Масквы Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, але, напэўна, і ў існаваньні беларускага экзархату, і ў беларускамоўным казаньні на Раство ў Менскім Катэдральным Саборы. (Адзін раз у месяц.)

## *Магілёўская „обитель”*

Практычнае прыстасаваньне тэарэтычных тэзаў, выказаных у часопісах „Православие или смерть” мы сустрэлі ў Магілёве. Там, у мурах унікальнага помніка беларускага праваслаўнага барока — комплексе Мікалаеўскай царквы — разьмясьціўся апошнім часам манастыр РПЦ. „Обитель” разгарнула бурную будаўнічую дзейнасьць, і, апроч пабелкі самой царквы, на тэрыторыі рэдкага помніка архітэктуры быў узьведзены „хрушчоўкападобны” новы корпус, які парушыў эстэтычныя прапорцыі ўсяго комплексу. Чырвоная дахоўка, якая нагадвала пра эўрапейскія традыцыі беларускай архітэктуры, была заменена простай бляхай. Пад пагрозай зьнішчэньня падчас рамонту апынуліся і старадаўныя рэшткі (каркас) іканастаса Мікалаеўскай царквы. Менавіта для таго, каб паглядзець стан гэтага выдатнага твору мастацтва беларускай рэзі, якой у XVII стагоддзі беларусы шчодра падзяліліся з Маскоўскай дзяржавай (гвалтоўны захоп і вываз беларускіх майстроў у Масковію царом Аляксеем Міхайлавічам), а таксама каб сфатаграфаваць інтэр’ер, мы з калегам накіраваліся ў Мікалаеўскі манастыр.

Увайшоўшы цераз браму, мы накіраваліся да настаяцеля па дазвол увайсьці ў зачыненую царкву і сфатаграфаваць інтэр’ер. Думалі мы, што з гэтым ня будзе ніякіх праблемаў, але памыліліся. Замест беларускай (і перадусім хрысьціянскай) гасьціннасьці ў гэтым манастыры РПЦ нас зрабілі ўдзельнікамі спэктаклю, у фінале якога быў „от ворот — поворот”.

Сустрэў нас бацюшка сярэдніх гадоў (па вымаўленьні, верагодна, прыехаўшы з „среднерусской возвышенности”). На нашу просьбу (па-беларуску) адчыніць царкву, каб пабачыць інтэр’ер з славутым іканастасам, ён насьцярожыўся і пачаў распытваць:

— А кто вы такие?

— Мы зь Менску, цікавімся беларускай культурай, хацелі б толькі зайсьці ў царкву, пабачыць іканастас і фрэскі, а мо й сфатаграфаваць.

— А крещены ли вы? — раптоўна спытаў бацюшка.

— Так, я хрышчаны.

— А в православной ли церкви? — пільна прыглядаючыся.

— Так, у праваслаўнай.

— Посещаете ли православную церковь регулярно, признаете ль крестное знамение? — дапытваўся ён.

Пасьля яшчэ некалькіх „прыпіраючых да сьцяны” пытаньняў (хоць да просьбы проста зайсьці ў царкву або зрабіць там некалькі фотаздымкаў яны не датычыліся), мы паведамілі яму, што мы за *экуменізм* і ўзаемапаразуменьне між хрысьціянскімі канфэсіямі.

І падумаць было цяжка, што адно гэтае слова стане дэтанатарам наступных „откровений”.

Дальш пасьледаваў „паток інфармацыі” пра „врагов сьвятой Руси”, скіраваны, хутчэй, на публіку, што стаяла побач: двух магілёўскіх падлеткаў, матушку (мясцовую жанчыну зь мяккім беларускім акцэнтам), маладога манаха і двух „пришлых” (менскіх) краязнаўцаў-”экуменістаў”. Лёгіка была настолькі парадаксальная, што запомніліся толькі ўрыўкі фразаў: „протоколы сионских мудрецов.., мировой заговор против сьвятой Руси.., католики.., баптисты.., БНФ.., США.., Польша.., доллары.., националисты.., происки сатаны.., покайтесь и отрекитесь от всего этого!..”.

Пасьля абвінавачаньня баптыстаў, што замест каб „чтить крест животворящий, они распятия топчут под ковриками на своих сборищах”, мы зьдзіўлена спыталі: „А ці бачылі вы гэта асабіста?”. На хвілінку сумеўшыся, бацюшка адказаў: „Лично не видел, но мне рассказывали!”.

На заўвагі, што ня варта ілжэсьведчыць (хоць бы на баптыстаў) альбо пра Хрыстову запаведзь („Любіце ворагаў вашых”), бацюшка адразу знайшоўся: „Но не врагов Христа!”.

Кропкі над „і” былі расстаўленыя. Замест агляду Мікалаеўскай царквы (адзінага захаванага шэдэўра магілёўскага праваслаўнага барока) і яе ўнікальнага інтэр’еру, мы ўбачылі сумнавядомы расейскі спэктакль, які быў бы сьмешны, каб ня нашы рэаліі.

Ці можам мы, праваслаўныя беларусы, што жывём спрадвеку побач зь іншымі беларусамі-хрысьціянамі, спакойна глядзець на праявы нецярпімасьці і неталерантнасьці да нашых братоў пратэстантаў або католікоў (а таксама да іншых вызнаўцаў веры)?! Такі расейскі імпарт нам не падабаецца.

***Славік ПРАВАЎ***

# ВЫКАЗВАНЬНІ

## *Пра эміграцыю*

*(Аляксей Дудараў, драматург):*

“Быкава не дэпартавалі, не інтэрнавалі... Што, ў Быкава стралялі? Яго выкрадалі?.. Вядома, выехаў — і жыць трохі лягчэй... Не хачу нікога асуджаць, але меркаваць пра сэнс існаваньня ў час адпачынку, на курортным пляжы, пад шолах хваляў, з бутэлькай віна і добрай

кабетай побач значна больш камфортна, чым будаваць гэты Дом: у пыле і брудзе ўкладываць цаглінку за цаглінкай.”

***(Белорусская деловая газета, — 2001, 12.01)***

### *„Легітымны прэзыдэнт”*

*(Аляксей Дудараў, драматург):*

“Што тычыцца прэзыдэнта Лукашэнкі, ён — кіраўнік краіны, для мяне ён легітымны прэзыдэнт.”

***(Радыё „Свабода”, 20 студзеня 2001 г.)***

### *Пра Беларускую нацыянальную ідэю і БНФ*

*(Юры Хадыка, намесьнік Старшыні БНФ, 1999 г.):*

“Нацыянальна-вызвольная ідэя, якая была стрыжнем у дзейнасьці БНФ з канца 80-х гадоў, у значнай ступені вычарпала сябе...

Аптымальна было б не падзяліць Фронт, а аб’яднаць яго з Аб’яднанай грамадзянскай партыяй і іншымі партыямі гэтага накірунку.”

***(Бюлетэнь „Избиратель”, №9, чэрвень, 1999 г.)***

## ПРЭС-РЭЛІЗ

*(паводле „Народнай Волі”, „Нашай Свабоды”, SANA, „БДГ”; кастрычнік, лістапад 2000 г.)*

■ У Гомельскай вобласьці запазычанасьць па заробках дасягнула 2-х мільярдаў рублёў.

■ „SANA”. Чыгуначны райвыканкам у Віцебску спусьціў на ўсе прадпрыемствы і ўстановы пагрозьлівую тэлефанаграму: „У сувязі з неадбыўшыміся выбарамі, прашу 17.10.2000 да $10^{00}$ паведаміць наступныя зьвесткі: найменьне арганізацыі, прозьвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка, ягоны хатні адрас, нумар акругі, выбарчага ўчастку, дзе мусіў галасаваць і ці прыняў удзел у галасаваньні. Філіпенка”. На філіпенках трымаецца рэжым.

■ *16 кастрычніка* раніцай на кватэры крычаўскага каардынатара па назіраньні за „выбарамі” ***С.Баравікова*** зазваніў тэлефон. Невядомы голас папярэдзіў, каб гаспадар асьцярожней хадзіў па вуліцах, а то можна і пад машыну трапіць.

■ *27 кастрычніка.* У Менску на плошчы Незалежнасьці прадстаўнікамі спэцслужбаў быў затрыманы польскі турыст пры спробе сфатаграфавацца на фоне помніка Леніну. Журналіста часопісу *„Тыгоднік Падгаляньскі”* ***Юрэка Юрэцкага*** завялі ў службовае памяшканьне Дома ўраду, дзе „людзі ў мундзірах” дзьве гадзіны дапытваліся, што ён хацеў зрабіць зь Леніным. І яшчэ праз гадзіну яго выпусьцілі, толькі ўжо з Маскоўскага РАУС. Сп.Юрэцкі прызнаўся, што нібыта пабываў у сваёй маладосьці. Дзеяньні беларускіх сілавікоў нагадалі яму польскую мінуўшчыну часоў ваеннага становішча пры Яруззэльскім.

■ *Беларускі Гэльсінскі Камітэт* выступіў з заявай аб фальсіфікацыі ўладамі вынікаў парляманцкіх выбараў: „Для нас відавочна, што вынікі выбараў сфальсіфікаваны, а абраны такім шляхам найвышэйшы заканадаўчы орган краіны ня можа быць прызнаны легітымным.”

■ Каля прыёмнай Сакратара Савету Бясьпекі па вул.К.Маркса, 38 сабралася каля 40 грамадзянаў, якія прагнулі ў прыёмны дзень сустрэцца з начальнікам. Аднак прапаршчык службы бясьпекі „прэзыдэнта” сказаў, што прыёма ня будзе. Людзі, што прыехалі з розных канцоў краіны, хацелі, каб іх прыняў хаця б які намесьнік. Пасьля доўгіх дыскусіяў, ў прыёмнай засталіся тры пажылыя жанчыны. Ім настойліва казалі выйсьці прэч, а потым супрацоўнікі службы бясьпекі сілай вытурылі іх на вуліцу. Адна з пацярпелых на наступны дзень зафіксавала пабоі ў медыцынскай установе і падала заяву ў пракуратуру па факту зьбіцьця яе ў адміністрацыі „прэзыдэнта”.

■ *З 30 кастрычніка* па ўсёй Беларусі ва ўстановах адукацыі разгарнулася акцыя пратэсту педагогаў. Настаўнікі патрабуюць падвышэньня заробкаў. У кастрычніку сярэдні заробак па галіне адукацыі быў усяго 44 тысячы рублёў, што складае толькі 53% ад сярэдняга заробку ў прамысловасьці і 82% ад мінімальніга спажывецкага бюджэту. Заробак маладога пэдагога з сярэдняй спэцыяльнай адукацыяй раўняецца 18 тысячам рублёў, а з вышэйшай — каля 20,5 тысячаў рублёў. Максімум, што можа атрымаць выхавацелька з усімі надбаўкамі за катэгорыю і стаж, гэта 37 тысячаў рублёў. Тэхнічны пэрсанал — яшчэ менш: прыбіральшчыца мае 14-15 тысячаў *(кілаграм рыбы каштуе 20 тысячаў руб.).*

■ У адпаведнасьці з дадзенымі назіральнікаў па 196-му выбарчаму ўчастку 99-й акругі Менска, колькасьць выбаршчыкаў на дзень выбараў 15 кастрычніка складала 2678 чалавек, а пры падвядзеньні вынікаў галасаваньня колькасьць выбаршчыкаў зьменшылася на 1397 чалавек *(52%).* Па ўчастку №220 той жа акругі колькасьць выбаршчыкаў за дзень галасаваньня зьменшылася на 792 чалавекі *(37%).* Куды зьніклі выбаршчыкі — застаецца загадкай. Такія зьявы назіраліся на ўчастках №№ 621, 622, 623, 626, 629, на ўчастку №110 Менску, у Гомелі, Магілёве ды іншых месцах. Нягледзячы на ўсе гэтыя маніпуляцыі і парушэньні Выбарчага Кодэксу, выбары, паводле дадзеных незалежных назіральнікаў, не адбыліся ў Берасьці, Віцебску, Магілёве, дзьвюх акругах Гомеля, Баранавічах, Барысаве, Маладзечне, Салігорску і ва ўсіх акругах Менску. Аднак афіцыйныя ўлады сцьвярджаюць адваротнае. Так дадзеныя назіральнікаў паказваюць па Аўтазаводзкай акрузе ў сталіцы ўдзел у галасаваньні 34-х адсоткаў выбаршчыкаў, а камісія — 50,17%. У Купалаўскай — 47% і 53%. У Сьвіслацкай — 38,4% і 57,98%. У Чкалаўскай — 43% і 50,79%, у Енісейскай — 44% і 53,4%, у Паўднёва-Заходняй — 45,63% і 54,8%, у Сухараўскай — 47,6 і 51,33%, у Заходняй — 46,9% і 50,07%, ва Ўсходняй — 49,6% і 50,22% , у Мендзялееўскай — 49,9% і 51,41%, у Трактаразаводзкай — 48% і 51,04%. Па Гомелю ў Юбілейнай акрузе — паводле дадзеных назіральнікаў, прагаласавала 47,2%, а камісія сцьвярджае, што 50,2%. У Сьветлагорскай акрузе — 45,8% і 56,1%.У Першамайскай акрузе Бабруйску — 41% і 51%. У Ленінскай акрузе Магілёва — 44,6% і 50,1%, у Кастрычніцкай — 35% і 52%. У Маладэчанскай гарадзкой выбарчай акрузе — 47,5% і 50,06%, у Салігорскай акрузе — 43,2% і 51,47%.

■ *Адзін з буйнейшых вытворцаў* фасфатных угнаеньняў Гомельскі хімічны завод перапыніў выраб прадукцыі. Справа ў тым, што сельская гаспадарка проста не плаціць за гэтую прадукцыю. На сёньняшні дзень запазычанасьць перад заводам складае паўмільярда рублёў.

■ *8 лістапада ў Менску* адбылося несанкцыянаванае пікетаваньне амбасады Расеі. Сваякі пікетоўшчыкаў паехалі за доўгім расейскім рублём у Якуцію. Як гэта бывае даволі часта, у Расеі беларусаў нахабна надурылі, завабіўшы ў пастку. Беларусы чамусьці любяць трапляцца на расейскую вуду: езьдзілі будаваць ваенныя гарадкі ў Чачэнію і г.д. У выніку атрымалі шыш. Добра, што вярнуліся жывыя.

■ *11-12 лістапада ў Віцебску* адзначаліся ўгодкі пакутніцкай сьмерці ***Сьвятога Язафата Кунцэвіча***. Ва ўрачыстасьцях браў удзел Папскі візытатар на Беларусі вуніяцкі сьвятар ***Сяргей Гаек***. Служылі імшу ў касьцёле сьв. Варвары. На імшу прыехалі многія людзі з па-за Віцебску, сярод іх Рыгор Барадулін, маці Галіны Пазьняк.

■ *„У прадпрымальнікі б пайшоў,* але там задушаць...” 25 лістапада прайшоў аднадзённы агульнанацыянальны страйк індывідуальных прадпрымальнікаў. Толькі ў сталіцы ў ім узялі ўдзел каля 60 тысячаў чалавек. Акцыя пратэсту ахапіла таксама Віцебск, Гомель, Горадню, Баранавічы, Пінск, Салігорск, Слуцк, Рагачоў, Ліду, Слонім, Дзяржынск і іншыя гарады. Там была спынена праца на ўсіх рэчавых кірмашах. Прадпрымальнікі прадэманстравалі сваю нязгоду з падаткавым гвалтам з боку дзяржавы. Галоўнае патрабаваньне — скасаваць новыя мытныя правілы, паводле якіх прадпрымальнікі мусяць з 1 кастрычніка плаціць мытны падатак на тавары трэціх краін, якія ўвозяцца ў Беларусь з Расеі.

***Валеры БУЙВАЛ***
***Прэс-сакратар Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***

# COMMUNISM AS A FORM OF THE RUSSIAN IMPERIALISM

Using the word „communism" I mean the system of power, the political system and the ideology which existed in the former Russian empire,— the Soviet Union,— from 1917 till 1991.

Historically this empire (its politics and ideology has been founded by the Mongols and has been formulated in the postulate: „go to the last sea". During many centuries the capitals and the leading groups of the Tchenghiz -Khan's empire have been changed, its name has been changed, but its scale, its Euro-Asian sense and its political character (the war and its ideology: „go to the last sea", „to the victory of the Russian army", „to the victory of the communism") remained unchanged.

This empire didn't collapse. It was transformed and transfigured several times. In periods of the transformation it lose for a short time its territories on the outskirts of the empire. And then it absorbed the Russian, Byzantine and Prussian experience or the ideology of the world communism. It started anew its expansion and restoration of its territories with the scope not to create something but to subjugate, to rob, to devore, to destroy, to lie.

The lie is the main definition of the political style, of the existance and of the relations in the Russian empire. The lie which had been erected as the symbol of the faith is the essence of the relations in the communism.

The communist period in the history of the transformations and the consolidation of the Russian empire is a new form of power in the ancient colonial state. The dynastic tradition of the Russian tsarism has been interrupted, and the form of the imperialist ideology has been transformed in 1917. A political group (a party) was established in place of the dynasty, an autoritarian dictator in place of the tsar, the marxism-leninism in place of the orthodoxy. The imperialism, the russification, the oppression of the person, the serfdom, the aggression and the war-these methods remained unchanged.

"Russia is a military state", — said the Russian tsar Nikolas I. Russia had prepared the partition of the Polish-Belarusan state (Rzecz Pospolita), has occupied Belarus and the Baltic territories, has break up the balance in Europe, has caused many wars for the partition of the world in 18-19 centuries. Then Russia has provoked the I WW and the II WW. It is not excluded that Russia will provoke the III WW to save itself.

It was necessary to destroy totally all the opposition and potencially not consenting forces in order to trasform the power and the ideology, to establish the new autoritarian regime and to restore the serfdom in the countryside and in the economy. The mass repressions, the executions and the system of consentration camps of GULAG were necessary for the absolute supremacy of the new regime, for the transformation of the empire and for the preparation of the war. These crimes chocked the Occident but not confused Russia because they resulted from the context of its history, from its slavery Euro-Asian (it means not European and not Asian) mentality and from the egalitarian psycology of its population.

The communism was not the substancial phenomenon in Russia, it was only the totalitarian form of the imperialist power. The so-called „builders of comunism" didn't do some crimes, destructions and constructions for the triumph of the communism. Everything was subordinated to the exclusivity, to the defence and the strengthening of the new totalitarian power and of the new Russian superstate which under the communist power has been transformed to the real threat for the whole world.

The Russian language became an ideological attribute of the communist „theory" of the unification of languages (it means of the russification) in the USSR. The Russian has been proclamed as „the universal" language of the future communist society, as the langyage of the so-called „Soviet people" of the new imperialist identity produced by the Russian communists. The russification was carried on and controlled by the communist party of the Soviet Union consecutively.

The national cultures could exist partially only in form of the collaboration with the regime and within certain limits. In Soviet Belarus in 1970s even the Belarusan fairy-tales (printed before 1939 in Vilnya) and the old school-books of trigonometry in Belarusan were „in jail" in the so-called „special fonds" of the libreries. Only the works by Lenin and the Soviet literature which praised Russians and the communism were printed. In 1970s all the Belarusan schools have been closed and transformed to the Russian language in the Belarusan cities. The Belarusan history has been crudely falsified, and the history of Russia became the history of the USSR. The Belarusan young people was educated and brainwashed in this so-called „universal" language. The constructor of communism could not speak in Belarusan. The communists didn't praise this, such manifestations have been persecuted.

In Soviet time like in the past Belarus was a special object of the Russian politics and a zone of the experiments with the russification. In 1960s Nikita Khruschev has noticed with plaisure during his visit in Belarus that Belarusans will achieve the communism as the first (of course after the Russians) because they have refused to speak in Belarusan and have accepted the Russian „language". This was a praise to the death.

The death and the violance, the russification and the ethnocide, the annihilation of the culture and of the entire nations, the crimes against the humanity — there are the main signs and results of the russian imperialist communist.

During the WW II Belarus which has had 10 millions of inhabitants before the war has lost c.3 millions. C. two millions have been killed by the communist secret police NKVD yet before the war. 70% of the Belarusan writers, almost all the scientists and artists have been killed in Belarus. (The whole troupe of the Third Belarusan State Theater of Uladzislau Halubok has been arrested and almost everybody has been killed.)

People was killed in accordance with the nationality. A special label „natsdem" has been invented (that means „the national democrat", even if such party didn't exist). This label was used to blame all the Belarusans included by the stalinists in the lists of victims. The NKVD has invented the anti-communist party — SVB („Union of Liberation of Belarus"). The secret police arrested the people using this phantom and then carried out the pseudo-investigations, tortured, judged, deported to Russia and shot the innocent people.

After the peace agreement between Poland and Russia in Riga in 1921 (Riga's deal) Belarus has been divided by these countries. The border of the division has been drawn near Minsk. The NKVD has issued an order to kill the whole Belarusan population in the border-zone. The Russian occupants would make there an uninhabited territory. The frontier guards executed this order. The Soviet soldiers have had the rifles and the spades. When such a frontier guard met a lonely Belarusan man, woman or child in a uninhabited place (on the rood, in the field, in the forest) he killed the people and excavated the hole to bury the corpse. He did it in accordance with the instruction. The people in the countryside were afraid not so much of „the man with a rifle" as of the Russian with a spade. (These facts have been published in the Belarusan mass-media at the beginning of 1990s.)

In 1930s 95-99% of the Belarusan communist and state functionaries have been exterminated (almost all of them deported and shot). Even the directors and the industrial leadership have been exterminated.

The Russians were transferred from Russia to Belarus in place of the killed Belarusan administrators and communist functionaries. The Russians (the so-called „promoted persons") arrived in Belarus, occupied the posts, received the privileges, the property and the flats. At once they closed the Belarusan schools, transformed them into the Russian language to facilitate to their children the studies. Their children should not learn „the absolutely unnecessary" (they told so) Belarusan langyage. In such way the occupants formed „the Russian speaking population" in Belarus. The ethnocide, the linguicide, the mnemocide and the genocide were carried out by the bolsheviks simultaneously.

The Russian NKVD continued to exterminate the Belarusans during the German accupation as well. In June 1941 in the first days of the war the communists have shot thousands of prisoners in the prisons and during the evacuation. They didn't have time to kill all the prisoners in the Brest fortress where the horrible prison of the NKVD was located. Some of prisoners have escaped. A big group of the guards and the NKVD officers has been surrounded by the Germans. They were blocked in the fortress until they dead aut. 20 years after

the war the communists have invented a legend about „the heroic defence" of the Brest fortress.

It is very important that the broad Soviet guerilla movement was organized only in Belarus and partially — on the ethnic Belarusan territories annexed by Russia (Smolensk and Bryansk regions). There was no guerilla activity on the territory of Russia occupied by Germans. Why? Because the plan of the extermination of the Belarusan nation was continued.

Moscow has engaged many civil citizens of Belarus in the war against Germans using the NKVD and then has put them under the blow. A necessary action was caused by the base idea and carried out by the not less base methods. (Stalin would have a double profit.) The NKVD officers killed the Germans specially near the Belarusan villages in order to provoke a German punitive actions. The Germans as a rule destroyed the village (often with the inhabitants). In this way the famous village Khatyn has been destroyed, apropos as a result of the provocation by the Soviet guerilla. Then in 1970s the communists have proclamed to the whole world that Khatyn was a tipical victim of the fascist atrocity.

More than 9.000 Belarusan villages have been burned down as a result of such communist-fascist joined „activity".

300.— 400.000 guerillas fought in the forests of Belarus just in 1943. Moscow didn't have confidence in Belarusans. Because of that many Belarusan commanders have been ordered to go to the hopeless actions and to die, have been dismissed, killed and subjected to repressions. The Russians and the devote NKVD officers occupied their posts in the last period of war.

When „the red army" occupied Belarus in summer 1944 the Russians have mobilized the people to the army on the Belarusan territory. Tens of thousands of young Belarusan boys have been send to the front line without a necessary training. The Russian commanders ordered them to attack under the fire of the German machine- guns when it was not necessary. They didn't have the weapon or the ammunition. Thousands of them perished like the grass under the scythe. Who tried to escape was killed by the „special forces" of the NKVD. The special forces shot to the back during the attack as well.

The extermination of the Belarusans was continued by the Russians and the Germans during the war simultaneously. As the communists told: „fighting for the soviet fatherland".

In 1940s the Russians have deported and killed in Siberia all the farest wardens and the so-called „kulaks" (prosperous peasants) from Western Belarus. They were deported in accordance with the special plan. In 1949-50 the so-called collectivization has been carried out. The authorities have confiscated the land, the main property and the cattle.

Under Khruschev the policy of the national and cultural extermination of Belarusans was continued. At the beginning of 1960s a plan was adapted at the secret plenum of the Central committee of the CPSU: Minsk with its 600.000 of inhabitants should be transformed to a huge city with some millions of the inhabitants. Moscow has decided to build the gigantic plants of chemical industry in Belarus which had to produce the goods for the whole empire. What means the rise of a big industrial center in the capital of Belarus (where was carried out the policy of russification) whithout the Belarusan shools and Belarusan universities — it is clear. This extension of the capital has been based (and partially executed) not on the economical but on the political reasons to intensificate the russification.

At the same time in 1964 the communists have elaborated a grandiose plan of the destruction of the Belarusan villages. The villages have been divided into „the prospective" and „the non prospective". The authorities evicted gradually the people from the „non prospective" villages, cut off the electricity and the radio, liquidated the shops and the public transport, ceased the financial transactions, liquidated the local centers of the cooperatives etc. The people should transfer themselves to the appointed place. Then the village was destroyed.

In accordance with this plan from 34.000 Belarusan villages should remain 9.000. 25.000 should be liquidated (as „non prospective"). During the was the Germans together with the Russians have destroyed 9.000 Belarusan villages.

This was a plan of the national and cultural catastrophe in Belarus. The culture and the cultural traditions are connected with the historical territory where the people is living. The culture and the traditions can exist and develop only owing to the permanent population. The intensive, radical and sudden internal migration destroy the traditional culture. (The Tchernobyl zone is the ecological, social and culturale catastrophe.)

Since the last years of 1960s the plan of the liquidation of 73% of the Belarusan villages was started. (At the same time the historical centers of the Belarusan cities were destroyed.) This plan was based on the pseudo-scientific demagogy. It was economically unprofitable and was a result of the political idea of the ethnocide of Belarusans (which was not publicly announced).

The communists could carry out this plan only partially. First, they didn't have enough resurses and forces to finish the action fast. Secondly, the communism was over. But the Belarusan people was very hardly hit.

The next blow was inflicted during the Tchernobyl catastrophe, 70% of the radioactive fall-outs have been disperced on the Belarusan territory. In accordance with the order from Moscow the Russian „comrads" have used the aviation to cause the precipitations from the radioactive clouds over the Moghilev region. They „saved Russia" over our territory because Belarus was an occupied country and didn't have sovereignty.

I have seen the dead radioactive villages in Moghilev region with the empty houses and the 3 meters high nettle on the empty streets. I have seen how the villages have been buried, how the houses,— the heritage of many generations,— have been buried. There are thousands of deads, thousands of ill children, thousands of displaced persons whithout the native land, whithout the heritage. They are refugees in their own country...

About Kurapaty. Kurapaty is a irrefutable testimony of the communist genocide in Belarus. The archeologists have started here the exhumation using the archeological methods. Because of that it was possible to investigate the tombs on the base of the scientific methods, to find the vestiges of the previous excavations executed in the end of 1940s — at the beginning of 1950s and to see that the major part of the bones of the shot people has been removed. The analysis of the facts confirms that more than 200.000 persons have been shot in Kurapaty since 1937 til June, 23 1941. This was a death's conveyor of the NKVD.

I could find five such places more near Minsk and collect the facts about one place (Loshytsa) in addition to Kurapaty. In Belarus there are known c. ten places where the communists shot and buried the people. Many places are near Moghilev where the second big center of the NKVD existed (after Minsk).

The collapse of the Soviet Union and the CPSU was started in 1988 when the Popular Fronts were founded in Estonia, Latvia, Lithuania, Belarus, Ucraine. When the ideas of the political struggle for independence and democracy have been formulated.

In 1991 the CPSU has ceased its existance, the USSR has collapsed, and the Russian nomenclature democrats have taken over the power in Russia. In three years only they have returned to the old imperialist policy of the intervention, the occupation, the aggression and the extermination. The first colonial war against Chechnya (1994-96) has ended the postcommunist period of the transformation of the power in the Russian empire. The transformation was over. The process of the restitution of the lost has been started.

Belarus became the next object of the intervention. In 1996 Russia has supported its henchman Lukashenka taking part on the high state level in the coup d'etat in Belarus. The Soviet KGB has taken the power in Belarus. The pro-Moscow dictatorship was established.

In four years the KGB has seized the absolute power in Russia. Now the communism doesn't exist more but there are the concentration (filtration) camps in Russia. Russia is carrieng out the genocide and the extermination in Chechnya using the army and the modern weapons. In Russia are suppressed the mass-media and has been introduced the censorship. The people is interned in the concentration camps, tortured, humiliated and murdered. In accordance with the plans of the Russian generals two thirds of the Chechen nation have to be killed and the montainous area of Chechnya has to be depopulated.

This is done before the whole world. What sense is to speak now about the communist crimes in 1940s when the same Chechens, Ingushs and Tatars have been exterminated and deported to Siberia? When is more sense to speak about

the Russian crimes: then when the Russian state communism and the Russian state banditry existed? Or now when the Russian communism doesn't but the Russian state banditry does exist?

The communism in the Soviet Union was first of all the form of the Russian colonialism, the ideological conception of the Russian imperialist policy.

When in the middle of 1980s this form has been compromised and exhausted the communist orthodoxes have lost the power. At the same time the so-called Russian democrats (the same imperialists) have disappeared, dissolved in the depths of the Russian power. The KGB became gradually the real and unic political force in Russia.

In 1993-95 the imperialist chauvinism was established very quickly as the state ideology. (Zhirinovsky who is near to the special services has played the role of clown in this process professionaly in accordance with the Russian mentality and the tradition. The state leaders which repeated the same words after Zhirinovsky in more decent tone were understood seriously. Only „the lawyer's son" was ridiculed.)

This is a KGB's technology to seize the power as well as the explosions of the houses (together with the inhabitants) in Moscow and Volgodonsk. The sense of these events is in the dominating role of the KGB-FSB (the former NKVD) which has now the full and absolute (and soon — total) power in Russia.

This regime is carrieng on the non-just, dirty was, is exterminating the people, is commiting the war crimes, is violating the human rights but all the Russia politicians and the whole Russian society are praising and supporting these actions. Thus they are responsible for the killings and the genocide.

The Russian regime is preparing the annexation of Belarus, is supporting the anti-democratic illegal Lukashenka's regime. And the whole Russian society is praising such predatory policy.

The Russian society is supporting the regime of Putin-KGB-NKVD decidedly as well as it has supported the criminal actions of Muraviov-hangman, of the tsar, of Stalin and Lenin. This is the society which is agree and is supporting every barbarous crime commited in interests of the Russian empire. This is the society whithout the intelligentsia, without the ideals of liberty.

The communism became the advantageous screen for the Russian imperialists. It is not important if they are regarded as the democrats or as the non-democrats. They can hide behind this screen. The communism became the expiatory goat for them. They can accuse it of all the past anti-human Russian sins and excuse the new crimes using the communism as the scarecrow for the desoriented society and the credulous international opinion.

It is impossible to regard the communism only as the abstract category which is commiting the crimes in itself. It is rightly only as a definition. But if we are analysing the problem of the resposability for the crimes commited by the Russian communists we find not only the ideology but also the concrete persons the executors of the crimes, the political organization, the state system and the accordingly organized society. Everybody has its part of the guilt. But nobody is thinking about the repentance in Russia.

There is the responsibility for the mass crimes against the humanity not only of the concrete persons. This responsibility is not only individual but collective as well. There are the different degrees of the punishment.



***1989 год. Мітынг Жалобы ў Курапатах.***

The international trial has to examine the communism in its concrete content. I mean the Russian communism. There was not the other kinds of the communism in Europe.

The tribunal in Nurenberg has tried not the abstract but the German fascism and the concrete criminals. It was taken the decision to liquidate the possibilities of the restoration of the German militarism. The German nation (not the fascists but the people, the nation which has used the fascism) paid the contributions for the destroyed monuments of culture of other peoples, for the holocaust and the gas-cameras, for the exploitation of the prisoner's work (and is paieng still now).

Who will pay to Belarusans for two millions of the compatriots killed by the Russian communists? Who will pay for the exploitation of the Belarusan woodcutters, for the work in the polar regions? Who will pay for the stolen objects of culture which are now in the Russian museums and in „the chambers" in Moscow? Who will pay us for Tchernobyl?

The Occident has defeated the communist system without the weapon has won the cold war. And at once it started the restoration of the Russian monstre thinking naively that it is helping to the democracy and that the evil is dead. In such circumstances the stauggle against the Russian communism looks like the staruggle against the paper tigers. It is only strengthening the imperialism which has changed the masks.

Seven years ago I and my colleages, Mps of the Belarusan Popular Front in the Supreme Soviet of Belarus, told, wrote and warned several times about the possibility of the dictatorship in Belarus, about the future Russian aggression, about the threat to lose the independence. Now we are observing the actual events and are remembering with sadness how thoughtless the Belarusan elites traited the reality.

Now Moscow and its assistants in the Occident have only to legitimize the Lukashenka's regime using every elections (including with the non-democratic). Then the 300.000 soldiers strong Russian military group will be ready to enter Belarus. They are talking about „the intergration" but are preparing the occupation. Then „a corridor" to the Kaliningrad region and the occupation of Lithuania could be carried out. We understand this policy of the Russian generals — „to restore the lost territories". Unfortunately the people doesn't know the history. At least in Eastern Europe.

If the evel is not tried it become a norm. Because of that it is necessary to bring the Russian communism, „the empire of the evel" to the trial.

The trial has to be started. Millions of the innocent victims cannot remain without the satisfaction and without the justice. Their blood is not the water.

The Russian communism,— the criminal empire of the aggression and the war,— has to be brought to the trial of the free countries of Europe.

***Dr. Zianon PAZNIAK***
***Chairman of the Belarusan Popular***
***Front „Adradzennie"***
*June, 12, 2000*
*(Пераклаў зь беларускай мовы Валеры Буйвал)*

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы
**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**
**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**
**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**